Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)

№ 37 (249)

13 верасня
1995 г.

Кошт — 500 рублёў

ЯК ЗНІКАЮЦЬ БЕЛАРУСЫ Стар. 2.

«НАРОДНАЯ ВОЛЯ»: ПЕРШЫЯ КРОКІ Стар. 7.

ДАНОС НА СЯБЕ Стар. 7.

ПОСТУП ТЫДНЯ

○ **ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ВЫДАЎ УКАЗ АБ АБ'ЯДНАННІ АШЧАДНАГА БАНКА З «БЕЛАРУСБАНКАМ»**. Указ гэты быў нечаканасцю як для супрацоўнікаў гэтых двух банкаў, так і для ўсіх работнікаў банкаўскай сістэмы, аж да самых высокапастаўленых. І, зразумела, для акцыянераў камерцыйнага «Беларусбанка».

Як сказаў адзін з незалежных экспертаў, на Захадзе пасля такіх падзей банк быў бы проста знішчаны.

○ ***ПА МЕРКАВАННІ АМЕРЫКАНСКАГА ЖУРНАЛІСТА, ВЫКЛАДЧЫКА КАЛУМБІЙСКАГА УНІВЕРСІТЭТА, БЫЛОГА ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРА КАМПАНІІ СІ-БІ-ЭС ПІТЭРА ХЕРФОРДА,*** *на Беларусі — самыя жорсткія на тэрыторыі СНД правілы тэлетрансляцыі. «Наўрад ці можна разлічваць на незалежнасць ва ўмовах, — зазначае аўтар, — у якіх дзяржаве паранейшаму належаць усе перадавальныя прыстасаванні і каналы».*

○ **У ДРУКУ З'ЯВІЎСЯ СПІС ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ**, якія зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь і маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. У спісе — 34 партыі. Асобна — спіс з 5 партый, якія прадстаўляюць арганізацыі ветэранаў Рэспублікі Беларусь.

○ ***ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А.ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ УДЗЕЛЬНІКАЎ І ГАСЦЕЙ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА І ДРУКУ,*** *які праходзіў у старадаўнім Тураве. У віншаванні прэзідэнт заявіў: «І хоць сёння эканоміка Беларусі перажывае не лепшыя часы, я як кіраўнік дзяржавы заяўляю: «Беларускую нацыянальную культуру, культуру ўсіх народаў, якія жывуць на Беларусі, мы будзем падтрымліваць». Дай то Бог!*

○ **У ПАЛІТЫЧНЫХ КОЛАХ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ПРАПАНОВУ АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА АБ ПРАВЯДЗЕННІ «КРУГЛАГА СТАЛА» З УДЗЕЛАМ АСНОЎНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ СУБ'ЕКТАЎ БЕЛАРУСІ**. Дагэтуль так званыя «круглыя сталы» арганізоўваліся выключна недзяржаўнымі структурамі.

○ ***СПОЎНІЛАСЯ 155 ГАДОЎ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ АКАДЭМІІ.***

○ **ПА ЗВЕСТКАХ З УПРАЎЛЕННЯ ЗНЕШНЭКАНАМІЧНЫХ СУВЯЗЕЙ МІНІСТЭРСТВА ТРАНСПАРТУ РЭСПУБЛІКІ**, з увядзеннем транзітнага падатку павелічэння паступленняў у рэспубліканскі бюджэт не плануецца. Калі за першае паўгоддзе 1994 года ў дзяржбюджэт паступіла 9,18 мільёна долараў, то са студзеня па чэрвень 1995 года — ужо менш як 9,03 мільёна долараў.

○ ***У АДПАВЕДНАСЦІ З РАСПАРАДЖЭННЕМ КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 12 МАЯ 1995 ГОДА*** *на ліквідацыю вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 1995 год выдзелена 1100 млрд. рублёў капітальных укладанняў.*

Будучыня, на 30% беларуская

Пачаўся новы навучальны год. З гэтай нагоды прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка звярнуўся да педагогаў рэспублікі, вучняў і іх бацькоў з віншаваннямі і пажаданнямі поспехаў у вучобе і працы. Прэзідэнт паабяцаў аказваць усямерную падтрымку народнай асвеце. У прыватнасці, з 1 верасня будзе зноў адноўлена выдзяленне сродкаў на прэміяванне ўсіх катэгорый педагагічных работнікаў у памеры 10 працэнтаў ад планавага фонду заработнай платы. (Дарэчы, прэзідэнт Расійскай Федэрацыі ў аналагічным звароце паабяцаў настаўнікам, што іх заработная плата ў бліжэйшы час павысіцца ў 1,5—2 разы).

Не ўсе знаходзяцца, аднак, у святочным настроі, многія бацькі заклапочаныя праблемамі матэрыяльнага характару. Журналісты паспрабавалі на старонках некаторых выданняў падлічыць кошт «партфеля першакласніка». Лічбы ва ўсіх варыянтах атрымліваюцца ўнушальныя, якія ў некалькі разоў перавышаюць сярэднюю зарплату інтэлігента.

Па звестках з Міністэрства адукацыі і навукі, мяркуецца, што прыкладна 70 працэнтаў бацькоў дзяцей-першакласнікаў адправяць іх у расійскамоўныя класы. Чакаецца змяншэнне колькасці навучэнцаў і ў 2—4 класах з беларускай мовай навучання. Адбудуцца змены і ў аплаце харчавання школьнікаў: яно стане адрасным і будзе выдзяляцца дзецям з сем'яў з цяжкім матэрыяльным становішчам. Здаецца, высветлілася пытанне з падручнікамі: пакуль настаўнікам дазволілі весці навучанне па існуючых падручніках.

Сёння ў Беларусі звыш паўтара мільёна школьнікаў. Ад таго, якія веды, а найперш духоўнае «праграмаванне» яны атрымаюць у школах, залежыць будучыня нашай краіны.

У наступным нумары «Нашага слова» чытайце гутарку з начальнікам галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі і навукі **Фяськовым Мікалаем Сцяпанавічам**.

Л.Ш.

З нагоды

«Гасударава вока бачыць далёка»

Ёсць такая народная прыказка, што вынесена ў загаловак, яна прыгадалася пасля ўважлівага знаёмства з пасланнем прэзідэнта Рэспублікі Беларусь галоўным рэдактарам газет, кіраўнікам інфармацыйных агенцтваў і іншых сродкаў масавай інфармацыі (СМІ) нашай дзяржавы. Выканаўчы кіраўнік знайшоў, што нават у нейкіх тэле- і радыёперадачах нехта прапаведуе нацыяналізм. Сапраўды дзяржаўная вока заўважае тое, што просты абывацель і не прыкмеціць. Бо хутчэй ён бачыць тэлежурналістаў з нейкімі спалоханымі вочкамі, якія з усяе сілы славяць «вертыкальшчыкаў» і «выкрываюць» бэнээфаўцаў, а заадно лідэраў свабодных прафсаюзаў.

Цяжка зразумець, а ці ўваходзяць у лік крамольных тыя перадачы і публікацыі, дзе прапагандуецца ідэя славянізма. Бо па сутнасці гэтаж сапраўдны круты нацыяналізм і нават імперскі шавінізм.

Журналістаў асабліва парадавала, што такая заклапочанасць аб ідэйнай якасці іхняй творчасці супала са святкаваннем Дня беларускага пісьменства і друку.

Л.М.

«Нёману» ў Чыкага 35 гадоў

Беларуская радыёперадача «Нёман», кіраўніком і адным з заснавальнікаў якой ёсць Нікадэм Жызьнеўскі, адзначыла 35-цігодзьдзе свайго існаваньня.

З гэтай нагоды губэрнатар штату Іліной, Джым Эдгар даслаў кіраўніку беларускіх радыёперадачаў Нікадэму Жызьнеўскаму прывітальны ліст у адзнаку за добрую й доўгагадовую працу ў інфармаваньні беларускіх слухачоў аб усіх справах, кранаючых іх. Губэрнатар пажадаў яму плённай працы ад імя грамадзян штату Іліной.

Радыёперадача ўтрымліваецца з дабравольных складкаў сваіх слухачоў. Радыёпраграма, якая ўключае весткі зь Беларусі, агляд прэсы, розныя мясцовыя паведамленьні, перадаецца раз у месяц на ўкраінскай праграме сп-ва Самбірскіх.

«Беларусь».



У вёсцы Люсіна, што ў Ганцавіцкім раёне, захоўваюць добрую памяць пра народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. У тамтэйшай школе чатырнаццаты год працуе коласаўскі музей. За гэтыя гады яго наведалі больш за 50 тысяч турыстаў. Апроч беларусаў, тут былі госці з Амерыкі і Расіі, азербаджанцы, кіргізы, немцы, палякі...

Удала падабраны матэрыял распавядае пра настаўніцтва Якуба Коласа ў 1902—1904 гадах.

Больш за дзвесце экспанатаў тагачаснага быту, сабраных у музеі, добра дапаўняюць асноўную экспазіцыю.

Фота Эдуарда КАБЯКА. Белінфарм.

АЛЕ!

Як знікаюць беларусы

Нацыянальная дыскрымінацыя ў Менскай гімназіі №20

Тры гады таму менская сярэдняя школа № 20 з паглыбленым вывучэннем французскай мовы намаганнямі яе дырэктара Галіны Крэль была ператворана ў беларускую школу-гімназію. Гэтая змена стала толькі адлюстраваннем і афіцыйным замацаваннем статуса школы як навучальнай установы вышэйшага ўзроўню, выпускнікі якой атрымлівалі веды значна больш грунтоўныя, чым навучэнцы звычайных школ, і, зразумела, мелі больш шансаў паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, каб працягнуць там сваю адукацыю. За апошнія гады ў школе адбылася яшчэ адна змена: у ёй былі створаныя тры класы, навучанне ў якіх вялося па-беларуску. З'ява гэтая была вартая ўвагі яшчэ і таму, што большасць беларускамоўных школ сёння працуе ў вёсках і дае сваім вучням адукацыю, узровень якой адпаведны назве гэтых школ — сярэдні.

У гэтым годзе пасаду дырэктара школы заняла іншая асоба. Што кіравала новым дырэктарам — тонкае разуменне дзяржаўнай палітыкі альбо асабістыя перакананні, — невядома, але з яго прыходам становішча навучэнцаў беларускіх класаў змянілася, і не ў лепшы бок. У адрозненне ад мінулых навучальных гадоў, набор у беларускія класы гэтым разам вёўся па-іншаму. Замест таго, каб набіраць вучняў у тры першыя класы, бацькам было прапанавана пісаць спецыяльныя заявы з просьбай(!) прыняць іх дзіця ў беларускі клас. Людзей, для якіх навучанне іхніх дзяцей па-беларуску аказалася прынцыповым патрабаваннем, знайшлося 12. Пасля таго 12 дзяцей прайшлі тэст на прыдатнасць да навучання ў спецыялізаванай школе. Асаблівасцю яго было тое, што пытанні беларускамоўным дзецям задаваліся па-расійску, што; зразумела ж, паспрыяла адсеву пяці з іх.

Сямёра першакласнікаў, нягледзячы на створаныя перашкоды, набралі патрэбную дзеля паступлення ў гімназію колькасць балаў і былі пэўныя: першага верасня яны сядуць за парты ў беларускай школе-гімназіі. Радасць іх аказалася заўчаснай: калі былі вывешаны спісы з імёнамі тых, хто паступіў у гімназію, іх там не аказалася. Здзіўленыя бацькі пачулі ад дырэктара школы: беларускага класа ў гімназіі не будзе ў сувязі з недахопам вучняў — замест яго створаны расійскі, а бацькі могуць забіраць свае заявы. Бацькі двух вучняў адразу ж перапісалі свае заявы, у выніку чаго іхнія дзеці пайшлі ўжо ў расійскамоўны клас тае ж гімназіі. Яшчэ трое перавялі сваіх дзяцей у іншыя школы. Трое тых, што засталіся, былі змушаныя наведаць усе ўстановы, кіруючыя сярэдняй адукацыяй, пачынаючы з міністэрства і скончыўшы раённым аддзелам народнай асветы, дзе іхнія заявы аб прыёме дзяцей у беларускі клас ляжалі нікому не патрэбныя, яшчэ за тры дні да пачатку школьнага года!

Што адбываецца ў 20-й школе-гімназіі сёння? Ад бацькоў дзяцей, штотам вучацца, мне давялося пачуць: выкладанне значнай часткі дысцыплін — хіміі, фізікі, замежнай мовы ды іншых — нават у беларускамоўных старэйшых класах вядзецца па-расійску — дырэкцыя не мае магчымасці ці папросту не жадае шукаць прафесійна прыдатных, валодаючых мовай настаўнікаў. Колькасць вучняў у другіх беларускамоўных класах — 32 чалавекі. І гэта ў той час як у паралельных расійскамоўных класах вучацца па 15 іхніх аднагодкаў! Першы клас, у якім навучанне вялося б па-беларуску, у гэтым годзе не быў створаны ўвогуле. Адной з падставаў гэтага было абвешчана, што частка дзяцей, што жадалі вучыцца ў гэтым класе, жыла ў іншых раёнах горада. Як ні дзіўна, гэтая прычына не стала перашкодай у фармаванні з дзяцей іншых раёнаў горада расійскамоўных класаў гімназіі.

— Пошук памяшканняў і настаўнікаў для стварэння беларускіх класаў — праблема не бацькоў, а школьнай адміністрацыі. Мы жадаем і будзем вучыць дзяцей па-беларуску. А калі нам даводзяць, што гэта немагчыма, бо ў беларускамоўны клас пададзеныя толькі тры заявы, дык гэта — вынік не абыякавасці бацькоў, а ўціску з боку школьнай адміністрацыі, прадстаўнікі якой нават тэлефанавалі людзям дадому, агітуючы, заклікаючы, просячы іх пісаць заявы ў расійскамоўныя класы. Ёсць мноства людзей, гатовых пісьмова пацвердзіць мае словы. Усё гэта азначае, што адбываецца свядомы націск з мэтай пазбаўлення нас, беларусаў, нашага канстытуцыйнага права навучаць дзяцей на роднай мове. Але ад гэтага права мы не адступімся, чаго б гэта нам ні каштавала, — пачуў я ад аднаго з бацькоў навучэнца школы. — Сустракаючыся з бацькамі іншых вучняў беларускіх класаў, я чую: у спецыялізаваных школах сталіцы — музычных, замежных моваў ды іншых — свядома скарачаюцца ці цалкам ліквідуюцца беларускія наборы. Гэта значыць, што нас зноў хочуць сапхнуць на ўзбочыну грамадства, і ў першую чаргу гэта датычыць тых дзяцей, якія маюць лепшае развіццё і прэтэндуюць на атрыманне адукацыі вышэйшага ўзроўню, — сказаў ён пазней.

Што хочацца дадаць да гэтых словаў? Тое, што выраз «сапхнуць на ўзбочыну грамадства» мае дакладны адпаведнік, ужываны юрыстамі, — дыскрымінаваць. Таму працытую дакумент, які, згодна з нашым заканадаўствам, мае перавагу над прававымі актамі, прынятымі ўладамі краю. Гэта — Агульная дэкларацыя правоў чалавека, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН 10 снежня 1948 г.

Артыкул 2. Кожны чалавек павінен карыстацца ўсімі правамі і ўсімі свабодамі, абвешчанымі гэтай Дэкларацыяй, незалежна ад расы, колеру скуры, полу, МОВЫ, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, НАЦЫЯНАЛЬНАГА ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага ці іншага стану.

Артыкул 26. 1. Кожны чалавек мае права на адукацыю.

3. Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віду адукацыі сваіх непаўналетніх дзяцей.

Артыкул 7. Усе людзі роўныя перад законам і маюць права, без усялякага адрознення, на роўную абарону законам. Усе людзі маюць права на роўную абарону ад усялякай дыскрымінацыі, якая парушае гэтую Дэкларацыю, і ад любога падбухторвання да гэткай дыскрымінацыі.

Вучыць дзяцей па-беларуску — не прывілея, а права. Гэта вынікае з дакументаў, падпісаных амаль паўстагоддзя таму нашай краінай — адной з заснавальніц ААН. Але ці стануць гэтыя словы справай хаця б у адной менскай школе?

У.ПАНАДА.

Ад рэдакцыі: А ў гэты час шаноўны Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь абвяшчае, што гэта нацыяналісты прапаведуюць русафобію і распальваюць процістаянне ў грамадстве.

Форумы

Да свабоды далекавата...

Беларускі пэн-цэнтр у Доме творчасці «Ісламч» правёў Другі міжнародны кангрэс у абарону дэмакратыі і культуры «Незалежная прэса: свабода і адказ насць».

Так, пастаянна дзеючы штогодні Міжнародны кангрэс у абарону дэмакратыі і культуры, які праводзіць Беларускі пэн-цэнтр пры падтрымцы Беларускага фонду Сораса, ператвараецца ў сур'ёзны грамадска-палітычны фактар яднання творчай інтэлігенцыі нашай краіны, у фактар салідарнасці з ёю калег з блізкага і далёкага замежжа на грунце правоў Чалавека і правоў Нацыі, што тычацца свабоды слова і друку.

І, канешне, тыя неспрыяльныя ўмовы, у якіх апынулася цяпер беларускае слова ў «Беларусі, прымусіла з'ехацца і сёлета ў «Ісламч» каля ста журналістаў, пісьменнікаў, праваахоўнікаў, навукоўцаў, палітолагаў і палітыкаў не толькі з нашай краіны, але і з Расіі, Украіны, Жамойці, Латвіі, Малдовы, Польшчы, Балгарыі, ЗША, Вялікабрытаніі, Даніі, Германіі, Ізраіля, Фінляндыі і Чэхіі.

Сярод іх — беларускія пісьменнікі Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, вядомы публіцыст Анатоль Казловіч, прафесар Анатоль Грыцкевіч, галоўны рэдактар газеты «Литературные вести» Валянцін Аскоцкі (Расія), польскі пісьменнік Яцак Бахэньскі, кінадраматург, галоўны рэдактар кінастудыі «Летапіс» Самсон Палякоў, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў прафесар Адам Мальдзіс, старшыня аргкамітэта Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Ліцвіна, дырэктар нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ Вера Багальянц (ФРГ), вядомая беларусістка Вера Рыч (Вялікабрытанія), дырэктар Беларускага інстытута навукі і культуры Вітаўт Кіпель (ЗША), паэт Міхаіл Забораў (Ізраіль).

Што ж казалі ўдзельнікі канферэнцыі ў сваіх дакладах пра становішча беларускага слова ў нашых грамадстве і дзяржаве? Пра яго свабоду ў СМІ? Вось толькі самыя кароткія вытрымкі з іх выступаў:

«І нерашучасць, і неўраўнаважанасць беларуская йдзе яшчэ й ад таго, што беларус не чуе родную мову ні на ўрадава-чынавенцкім узроўні, ні нават на побытавым, асабліва ў гарадах, якія планава засяляліся небеларусамі...» **(Рыгор Барадулін).**

«Вы, беларусы, ведаеце гэта лепей за нас, замежных гасцей, бо менавіта незалежнасць вашай прэсы сёння ў небяспецы. Вашу свабоду перш за ўсё спрабуюць задушыць...» **(Яцак Бахэньскі).**

«І ўжо сёлета, якраз у маі, падчас падпіскі на 3-ці квартал, былі сарваныя выпускі ці не ўсёй беларускамоўнай перыёдыкі, якая патрануецца Міністэрствам культуры і друку рэспублікі. Страту тыражам гэта палітыка нанесла каласальную: толькі газета «Наша слова» згубіла трэцюю частку падпісчыкаў...» **(Алесь Мікалайчанка).**

«...Па зместу, па духу «Літаратура і мастацтва», «Наша слова», «Культура», «Голас Радзімы», «Полымя» куды больш незалежныя, чым «грамадска-палітычная» «Цэнтральная газета»...» **(Адам Мальдзіс).**

«Але ж дзе там чакаць абароны справядлівасці ад нашых вучоных служак Феміды, калі і хамскі здзек з падранага, а юрыдычна ўсё яшчэ дзяржаўнага сцяга яны здолелі зневажальна кваліфікаваць як утылізацыю зношанага палотнішча?..» **(Генадзь Бураўкін).**

«Скажыце мне, якія газеты вы чытаеце, — я прадкажу, што будзе з вамі заўтра...» **(Анатоль Казловіч).**

Уласна, самыя цікавыя даклады газета «Наша слова» абавязкова надрукуе.

Вяртаючыся ж да кангрэса, які доўжыўся з 31 жніўня па 4 верасня, нельга не адзначыць той факт, што завяршэнне гэтага форуму прайшло пад знакам Алеся Адамовіча. Бо менавіта ў прысутнасці ўдзельнікаў кангрэса на станцыі Глуша — магіле гэтага мужнага і таленавітага пісьменніка-грамадзяніна быў адкрыты 4 верасня помнік. А яшчэ — уручаны прэміі імя Алеся Адамовіча тым журналістам, публіцыстам і кінематаграфістам-дакументалістам, якія прынцыпова адстойвалі дэмакратыю ў Беларусі, — Анатолю Казловічу, Паўлу Шарамету, Віталю Цыганкову, Валянціну Жданко, Самсону Палякову і Анатолю Алаю.

Алесь СЕРГІЕВІЧ.

Меркаванні

«Народная

Як і многія мае калегі, я паважаю журналіста Іосіфа Сярэдзіча. Шаную ў ім талент рэдактара, арганізатара газетнай справы. За тое, што непрыяцеляў ідэі незалежнасці Беларусі, развіцця ў краіне дэмакратыі ды сталявання правоў Чалавека, павагі да нацыянальных і агульна цывілізаваных духоўных каштоўнасцей выклікала раздражнёнасць і нават — агрэсіўнасць.

Успомнім пачатак шляху «Народнай газеты». Менш чым за пяць гадоў Іосіф Сярэдзіч і яго паплечнікі (а гэта Іван Макаловіч, Анатоль Казловіч, Сяргей Плыткевіч, Андрэй Юдчыц, Юрый Наяровіч, Аляксандр Класкоўскі, Мікалай Галко ды іншыя вопытныя, таленавітыя журналісты) здолелі завалодаць увагай чытацкай аўдыторыі недзе каля 1,5 мільёна чалавек (пры тыражы за 600 тысяч экземпляраў).

І такое — у наш пакручасты час эканамічнага ды іншых крызісаў, калі кожнаму даводзіцца сур'ёзна думаць: або падпісацца на любімае выданне, або купіць зусім не лішні кавалак «мокрай» каўбасы.

Не дзіва, што антыбеларускія, антыдэмакратычныя сілы пастараліся разбурыць гэты фарпост народнай думкі — не зважаючы на Законы і Канстытуцыю, быў звольнены з пасады галоўны рэдактар. Але знайшла каса камень. Апальны парламентарый і журналіст не прымірыўся з гвалтоўнай адстаўкай. І вось чытачы атрымалі першыя сем нумароў новай газеты Іосіфа Сярэдзіча — «Народнай волі», дзе ён адначасова і заснавальнік, і галоўны рэдактар. Пакуль «НВ» набірае разбег як штотыднёвік, але выпускаецца даволі салідным тыражом — ад 82 да 101 тысяч асобнікаў. 1 кастрычніка 1995 г. «Народная воля» будзе выходзіць штодня. Такім чынам, у інфармацыйнай прасторы Беларусі з'яўляецца сур'ёзнае штодзённае незалежнае дэмакратычнае выданне.

Уважліва прачытаўшы першыя выпускі «НВ», я канчаткова пераканаўся: яна мне патрэбна.

Але тут мушу зрабіць невялічкі адступ.

У 60-ыя гады, калі я вучыўся на журфаку Белдзяржуніверсітэта, выкладчыкі тэорыі партыйна-савецкага друку вельмі раздражняліся нібыта прыдуманым заходнімі журналістамі ды палітолагамі міфам пра свабоду друку ў краінах «гнілога» капіталізму-імперыялізму. Асабліва ім не падабаліся тэзісы з таго «міфа»: «СМІ — чацвёртая ўлада» або — «Журналістыка — пятая вялікая дзяржава на палітычнай карце свету».

Як я неўзабаве пасля заканчэння ВНУ зразумеў, гэтае прафесарскае раздражненне апанентамі з іншага ідэалагічнага полюса мела сваю прыроду: савецкая журналістыка прымушана была абслугоўваць толькі гаспадароў з таго ці іншага паверха ўладнай піраміды. Прызначэнне гэтай журналістыкі было дакладна акрэсленае — выконваць ролю «прывадных рамянёў» КПСС, карэспандэнцкае меркаванне павінна заўжды супадаць з меркаваннем менавіта КПСС, дакладней — таго ці іншага партыйнага камітэта, чыім органам з'яўлялася адпаведная газета. Але ўжо тады да нашага брата прабівалася інфармацыя, што на Захадзе сітуацыя іншая. Урадавых газет там практычна няма, а ёсць прыватныя, якія могуць выказваць і афіцыйны пункт гледжання на з'явы ды падзеі. Прычым колькі гаспадароў газет, столькі можа быць і меркаванняў, якія не заўсёды супадаюць з урадавымі. І нічога — капіталізм не рушыцца. У журналіста ёсць магчымасць знайсці «сваё» выданне: падабаюцца сацыялістычныя ідэі — ёсць такая газета, падабаюцца ідэі хрысціянскіх дэмакратаў — калі ласка, кіруй да іх і г.д. Словам, не трэба крывіць душой, падладжвацца, быць палітычнай прастытуткай.

Ну, а мы, у любой газеце, на радыё, на тэлебачанні павінны былі пісаць «у святле рашэнняў» чарговага з'езда «кіруючай і накіроўваючай сілы грамадства» ці мяняць прафесію. На пэўныя тэмы грамадскага жыцця было накладзена строгае «табу» — журналіст не меў права брацца за нешта такое, што не ўпісвалася ў мадэль «сацыялістычнага рэалізму».

Гарбачоўская перабудова, якая адчыніла шлюзы галоснасці, «табу» зняла з многіх забароненых раней тэмаў. Акрамя адной — крытыкі ЦК, АК, ГК і РК КПСС (КПБ). Вось тады ў інфармацыйным полі Беларусі і з'явілася «Народная газета». І яе канцэпцыя: крытыкаваць, нягледзячы на асобы, хваліць — таксама без аглядкі на начальства.

Тым не менеі, Іосіф Сярэдзіч разумеў — патрэбна новая сістэма падачы інфармацыі. Уласна, гэта вынікала з характару Вярхоўнага Савета, які і быў заснавальнікам «Народнай газеты». А характар быў у заснавальніка няпросты. У Авальнай зале разгараліся баталіі

паміж прыхільнікамі розных падыходаў да вырашэння той або іншай праблемы. І кожны бок жадаў, каб менавіта яму «Народная газета» ўдзяляла больш увагі. Асабліва, калі абмяркоўваліся важныя канцэптуальныя пытанні эканамічнага ці гуманітарнага накірунку: рынак, войска, адносіны з Захадам і з Расіяй, а яшчэ — мова і гісторыя Беларусі. Тады Іосіф Сярэдзіч у парадку абмеркавання, дыскусіі пачаў друкаваць аўтараў, чые погляды вельмі адрозніваліся між сабой. Так у беларускай прэсе ўзнік метад журналісцкага плюралізму. Я асабіста лічу, што менавіта гэты метад ва ўмовах перанасычэння чытачоў «пладамі галоснасці» спрычыніўся да пастаяння растучага інтарэсу да «Народнай». У яе з'явіўся свой твар: яна пераўтварылася ў трыбуну самавызначэння народа, асэнсавання свайго месца ў гісторыі і ў складаных узаемадачыненнях палітыка-эканамічных рэальнасцей паміж суб'ектамі былога СССР.

«Народная воля» ўзнікае ў іншых грамадска-палітычных умовах Беларусі, калі ўлада ўсё больш і больш скатваецца да аўтарытарызму, калі самыя агалцелыя сілы расійскага шавінізму павялі шырокі наступ на кволыя парасткі дэмакратыі ды нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. І як вынік — пераслед СМІ, што супрацьстаяць новай хвалі русіфікацыі ды прапаганды тэрытарыяльна-палітычнага альянсу з Расіяй, можа прынесці карысці ўсяму народу». Самае важнае — быць чэсным...

Якімі ж бачацца Іосіфу Сярэдзічу старонкі «Народнай волі»? Мяркую, на адказе на гэта пытанне самога галоўнага рэдактара і выдаўца варта засяродзіць асаблівую ўвагу:

«...Па-першае, мы будзем усімі дазволенымі сродкамі адстойваць правы і годнасць кожнага чалавека. У полі зроку журналістаў, няштатнага актыву будуць грамадска-палітычныя, эканамічныя, маральныя праблемы. Пастараемся аператыўна і аб'ектыўна знаёміць чытачоў з навінамі як нашай краіны, так і блізкага, і далёкага замежжа. З гэтай мэтай ствараем шырокую карэспандэнцкую сетку на ўсім свеце.

Ведаем: сёння, як ніколі, чалавеку патрэбен добразычлівы і ненадакучлівы дарадца. Аб гэтым падумалі загадзя: падабралі высокакваліфікаваных вучоных і спецыялістаў такіх галін, як псіхалогія, медыцына, юрыспрудэнцыя, педагогіка, культура, быт і г.д. Усе тыя раздзелы, якія звычайна бываюць на старонках масавых і папулярных выданняў, яны будуць у «Народнай волі». Словам, мы хочам зрабіць такую газету, якая адпавядала б патрабаванням чытачоў самых розных густаў. Няхай яна служыць нашым нацыянальным інтарэсам, няхай апраўдвае спадзяванні ўсіх, хто лічыць сваёй радзімай Беларусь».

Што ж заяўка цікавая. Намер ухвальны.

«Воля»: першыя крокі

хвалі, якую «гоняць» тыя самыя сілы рукамі, на жаль, уладнага ачалення дзяржавы.

У выніку — і выхад газет з «белымі плямамі», і судовыя працэсы з журналістамі, і гвалтоўная змена (ажно да прыходу амонаўцаў у Дом друку з наручнікамі ды сабакамі!) галоўных рэдактараў у чатырох «вялікіх» газетах самай рознай палітычнай скіраванасці.

У выніку атрымалася так, што пасля павароту вядучых масавых газет толькі ў бок цяперашняй кіруючай наменклатуры (а да друкаваных мас-медыа дадайце яшчэ тэлебачанне, радыёвяшчанне, якія традыцыйна паслухмяныя высокаму начальству), практычна не засталося больш-менш дэмакратычных СМІ, адкуль можна было б займець аб'ектыўную інфармацыю, акрамя газеты, некаторых лічаных штотыднёвікаў, ды штодзённага «Добрага вечара» з дадаткам «Сталіца». Але «Добры вечар» са «Сталіцай» былі прыпыненыя з дапамогай эканамічнага прэсінгу (іх проста пазбавіў сваёй фінансавай падтрымкі заснавальнік — Менгарсавет), а штотыднёвікі «Свабода» і «Фемида» агульным накладам у 110-112 тысяч асобнікаў ды з перыядычнасцю раз у сем дзён не маглі наталіць народны попыт на праўдзівую інфармацыю. Не ішла на прамое абвастрэнне адносін і «Звязда»...

Праўда, убачыўшы, што тыраж у трэцім квартале скараціўся больш чым на 300 тысяч падпісчыкаў (!), «Народная газета» пачала патроху вяртацца да агульнадэмакратычнай канцэпцыі падачы матэрыялаў. Гэта, канешне, «наверсе» не засталося незаўважаным, і цяпер новы галоўны рэдактар «Народнай», калі верыць інфармацыі, якая прамільгнула ў друку, рыхтуецца да адстаўкі: словам, абставіны хісткія, ненадзейныя.

Вось тут і з'яўляецца «Народная воля».

Што ж у такіх умовах яна прапануе чытачам? Якую нішу ў інфармацыйнай прасторы збіраецца заняць?

Ды ўсё тую ж самую, якую займала «Народная газета» Іосіфа Сярэдзіча. Хаця, трэба прызнаць, гэта будзе праблематычна, калі тэндэнцыя свайго аднаўлення ў сённяшняй «Народнай» падоўжыцца.

Праўда, Іосіф Сярэдзіч у першым нумары «НВ» у рэдактарскай калонцы абяцае чытачам, што новае выданне будзе катэгарычна адрознівацца ад дзяржаўнай прэсы, якую аўтар называе халуйскай.

У якасці доказу такога халуйства ён паказвае, як пераскруты «вертыкальная» прэса падае чытачу вынікі нядаўняга рэферэндуму, што здзівіў сусветную супольнасць сваёй няўцямнасцю, мякка кажучы.

«...На працягу многіх тыдняў афіцыйная прэса, радыё, тэлебачанне ўслаўлялі трыумф рэферэндуму. Хаця які ж гэта трыумф, — піша Іосіф Сярэдзіч, — па пытанню сімволікі «за» выказалася толькі 48,6 працэнта ад усёй колькасці выбаршчыкаў, па парламенту — 50,3 працэнта, па інтэграцыі з Расіяй — 53,5, па моўнаму пытанню — 53,9 працэнта. Прапагандысты-лакеі спецыяльна замоўчвалі і замоўчваюць гэтыя лічбы, а высоўваюць толькі тыя, якія атрымаліся ў выніку падліку «прыйшоўшых на выбарчыя ўчасткі». Але ж на адной зямлі жывуць і тыя, хто з белчырвона-белым сцягам звязвае нацыянальнае адраджэнне Бацькаўшчыны, яе заўтрашні дзень, і тыя, хто семдзесят гадоў будаваў «светлае будучае» і гатовы верыць у гэты міф да апошніх дзён свайго жыцця. Хлусня прэсы, радыё, тэлебачання на карысць адных не

Але, заўважым, у гэтым намеры адсутнічаюць планы дэманстрацыі палітычнага плюралізму. Час іншы: трэба абараняць чалавека, народ, суверэннасць краіны.

Ну, а як намеры ўвасабляюцца ў публікацыі? Сем першых нумароў «Народнай волі», здаецца, пацвярджаюць, што абяцанні галоўнага рэдактара не разыходзяцца са справай, перш-наперш актыўна прапагандуецца Беларускае Адраджэнне ва ўсіх яго іпастасях, шматграннасці і шматаблічнасці.

Праўда, калі гавораць пра Беларускае Адраджэнне, то многія найперш асацыіруюць гэты тэрмін з нацыянальнай культурай і мовай. Так, гэта абсалютна правільна. Тым не менш адраджаць трэба і эканоміку, і экалогію, і здароўе, генафонд нацыі. Інакш, прабачце, каму патрэбна будзе мова і культура, калі мы павыміраем усе давызнання?

Вось чаму я, напрыклад, застаўся задаволены пазіцыяй «НВ» у справе адраджэння нацыянальнай эканомікі — яе трэба тэрмінова выцягваць з крызісу шляхам рашучага рынкавага рэфармавання прамысловасці ды сельскай гаспадаркі. Мне спадабалася, што шмат у якіх матэрыялах аўтары ставяць за прыклад практыку заахвочвання дробнага і сярэдняга бізнесу ў цывілізаваных краінах свету, у тым ліку аналізуюць сталяванне рынку ў Расіі, адзначаюць адметнасць шляху беларускіх рэформаў, паказваюць усю ілюзорнасць спадзяванняў тых, хто хоча нашыя праблемы вырашыць за кошт інтэграцыйных працэсаў, зліцца з вялікім усходнім суседам. Пералічу толькі загалоўкі некаторых «эканамічных» матэрыялаў «НВ», якія мне асабліва кінуліся ў вочы. Інтэрв'ю, узятае агенцтвам РІД, — «Яўген Краўцоў, кіраўнік «Мінск Комплексбанка»: «Мы не ўдзельнічаем у палітыцы, але паводзім сябе так, як павінен паводзіць сябе палітык»; «Як Віктар Міргарадскі «вяртае прыгоннае права» і што з гэтага атрымліваецца» — артыкул Міколы Дубравенскага аб вопыце паспяховага пераходу ў рынкавую эканоміку магілёўскага калгаса «Камінтэрн»; «Мінуў адзін год, як Беларусь выбрала прэзідэнта. Што за гэты час адбылося?» — падборка выказванняў Аляксандра Лукашэнкі, Уладзіміра Заблоцкага, Аляксандра Дабравольскага, Васіля Новікава.

«Цемра ўлады, або аб карысці асветніцкай палітыкі» — гэты артыкул палітолага Анатоля Майсені супраць цемрашальства маючых уладу ў іх адносінах да рынкавых рэформ заўважылі і станоўча ацанілі многія».

«Што трэба зрабіць, каб заводы і фабрыкі запрацавалі ў поўную сілу?» — бліц-інтэрв'ю з Уладзімірам Карагіным, прэзідэнтам Беларускага саюза прадпрымальнікаў, Міхаілам Лаўрыновічам, прэзідэнтам Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі, і Францам Вітко, намеснікам старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі; «Упаўнаважаныя не накармілі краіну і не накормяць» — карэспандэнцыя Сяргея Казакевіча.

«Чырвоныя дырэктары» вядуць завочную дуэль з прэзідэнтам. Хто пераможа?» — артыкул Івана Калінкіна.

Раман Унучка: «Гаварыць аб рабоце і рабіць — гэта зусім не адно і тое ж. Як трапна кажуць адэсіты, гэта дзве абсалютна розныя рэчы» (інтэрв'ю).

Пералічаныя матэрыялы надрукаваныя адны на расійскай, іншыя на беларускай мовах — хто на якой змог, на той і сказаў пра важнае, набалелае. Галоўнае ж — усе публікацыі падказвалі, у які бок рухацца, па-

казвалі, чаго дасягнулі людзі, якія рашуча і разумна пайшлі на рэформы, прымушалі ўсвядоміць кожнага, што толькі мы самі і зможам зрабіць сваё жыццё цывілізаваным, заможным.

А спадзяванне на свой розум «па Сярэдзічу» — гэта першы чыннік патрыятызму. Бо, калі спадзяешся на ўласны розум, значыць спадзяешся на сваю зямлю, на свой завод, на сваю справу, якія толькі і чакаюць таго, каб ты змяніў да іх адносіны, стаў гаспадаром. А гаспадар у стане змяніць усё жыццё: накарміць, абуць і апрануць народ, зрабіць сваю краіну па-сапраўднаму незалежнай.

Культура, мова, гісторыя, палітыка... Мусіць, матэрыялы на гэтую тэму пераважаюць у «НВ». Іх, прыкладна, па аб'ёму займаемай газетнай плошчы і колькасці больш, чым эканамічных, у два разы. І гэта не дзіва, бо газета — грамадска-палітычная. А самае «хворае» наша пытанне — нацыянальнае.

І мне, прадстаўніку нацыянальнай творчай інтэлігенцыі, вельмі было ўсцешна, што газета тут заняла пазіцыю абаронцы беларушчыны.

Ужо ў першым нумары «НВ» друкуе ліст Л.Шынкоўскага, 58-гадовага рабочага з Бабруйска, «Жывеш на Беларусі — паважай Беларусь!» Яна, гэта заметачка, заслугоўвае таго, каб быць поўнасцю працытаванай:

«Я — не нацыяналіст. Мне ўсё роўна, хто, акрамя беларусаў, жыве ў маёй краіне: татары, узбекі, туркі, рускія, украінцы — усе яны людзі, але законы і мову маёй краіны павінны паважаць і нават ведаць. Калі нехта спрабуе пляваць на наша слова — гэта значыць, ён не паважае і мяне як чалавека. Дык няхай жа ўцямяць нашы правадыры, што наша мова — прыгожая мова, усім зразумела, што на нашай мове можна размаўляць, як кажуць, і дыпламатычна, і тэхнічна, і юрыдычна, а не зневажаць яе».

«Народная воля» дае таксама слова старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета, старшыні ТБМ імя Ф.Скарыны Нілу Гілевічу, які свой выступ пачаў так: «Я заклінаю вас: не слухайце лжэпрарокаў, палітычных прайдзісветаў і авантурыстаў, якія абяцаюць нам рай у чужым шалашы!» І гэтае слова-роздум народнага паэта і грамадскага дзеяча пра горкі лёс беларускай мовы ў прысавецкіх і цяперашніх палітычных варунках стала ажно практычна самым важкім у нумары. Дазволю сабе толькі адну думку, якая асабліва ўрэзалася ў памяць: «... Свабода не дзеліцца. Больш таго, пачынаць трэба са свабоды душы, з суверэннасці духу, а мова і ёсць душа народа. Толькі свабодная душа даб'ецца палітычнай незалежнасці для Бацькаўшчыны, у якой і будуць створаны ўмовы для развіцця нацыянальнай эканомікі, прадпрымальніцтва, сацыяльнай сферы, навукі і адукацыі, культуры і мастацтва».

Запомнілася чытачам і эсэ Івана Макаловіча «Чаму чырвона-зялёныя сцягі толькі ў Буркіна-Фасо, Беніне, Бангладэш і Беларусі? Хіба месца нашай краіне ў гэтай кампаніі?», пісьмо жыхароў сталічнага мікрараёна Сухарава-2 пад красамоўным загалоўкам «Мы хочам, каб нашы дзеці вучыліся на беларускай мове» («НВ», № 5), артыкул намесніка старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета, кандыдата гістарычных навук Алега Трусава «У школе ўводзіцца цэнзура?» (№ 6), эсэ настаўніка і вядомага публіцыста Анатоля Сідарэвіча «Бедная школа» (№ 7). Ды і «Зварот ветэранаў-дэмакратаў да насельніцтва Рэспублікі Беларусь» («НВ», № 4) з ёмістым рэдакцыйным каментарам — публікацыя не шэраговая. «...У дадзеным выпадку фармальна пытанні рэферэндуму, як вядома, не дамагліся адмены дзяржаўнасці беларускай мовы, — казалася ў каментары, — і пагаршэння не становішча ў грамадстве. Аднак тая кампанія, якую разгарнулі некаторыя высокія чыноўнікі па ліквідацыі беларускай школы і націск на бацькоў, дзеці якіх хадзілі ў беларускамоўныя класы, сведчыць, што занепакоенасць ветэранаў-дэмакратаў мае ўсе падставы».

Карацей, за родную мову і культуру, за гісторыю без «белых плямаў» «Народная воля» змагаецца так, як некалі змагалася «Народная газета» (толькі энтыклапедычных гістарычных артыкулаў пад рубрыкай «Духоўны скарб» «НВ» змясціла дзесяць у сямі сваіх нумарах). Словам, у інфармацыйнай прасторы з'явілася новае адметнае перыядычнае выданне, здольнае сур'ёзна паўплываць на свядомасць нашых землякоў. Так што, відаць, праз некаторы час цяперашнія 85 тысяч тыражу «НВ» пераўторацца ў 500 тысяч.

Праўда, многае будзе залежыць ад таго, наколькі «Народная воля» стане адметнай у параўнанні з першым «дзецішчам» Сярэдзіча. А «Народная газета» канаць не збіраецца, апошнім часам значна павялічыла свой прэстыж у грамадстве і патэнцыял у яе значны (калі яшчэ раз не ўмяшаецца «бацька» і не пачнецца новы разгон найбольш таленавітых супрацоўнікаў). Але добрая канкурэнцыя выданняў будзе толькі на карысць нам, чытачам.

Так што ў добры час.

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА, рэдактар культурна-грамадскага аддзела «Нашага слова», навуковы кансультант Інстытута праблемаў культуры.

Пытанне — адказ

Удзячны за газету

Шаноўная рэдакцыя, перш за ўсё дзякую за газету. Выпісваю і чытаю «Наша слова» з самага пачатку існавання. Газета вельмі патрэбная, і я задаволены яе зместам. Але было б пажадана, каб вы больш падрабязна і дэталёва пісалі аб важных падзеях у Беларусі. Вось адбылося свята Незалежнасці нашай дзяржавы 27 ліпеня, а ў «Нашым слове» надрукаваны толькі маленькі артыкул, дзе вельмі сцісла сказана, як праходзіла свята ў Менску ля помніка Янку Купалу, і паведамлена, хто выступіў. Але вельмі было б цікава ведаць, аб чым гаварылі выступоўцы. Ніводнай прамовы вы не надрукавалі. Праўда, прамову Ніла Гілевіча мне ўдалося прачытаць у газеце «Літаратура і мастацтва», бо выпісваю і гэтае дэмакратычнае выданне. А дзе ж, скажыце, прачытаць прамовы Пазьняка, Баршчэўскага, Знаўца, Янкі Запрудніка і іншых аратараў? Можа, гэта было небяспечна надрукаваць, то прашу Вас, шаноўны рэдактар, выслаць мне тэксты на любых умовах, праўда, калі і гэта магчыма. У нас, у мястэчку Старобін, ніякага свята не было, а проста яшчэ адзін выхадны, нават сцягоў ніхто не вывешваў — ні бел-чырвона-белых, ні чырвона-зялёных. Тым не менш дома, у коле сям'і некаторыя старобінцы свята Незалежнасці ўсё ж адзначылі.

Яшчэ адно запытанне. На ваш зварот аб фінансавай дапамозе мною пералічана цераз Ашчадны банк на рахунак № 700510, код 764 Белбізнесбанка 50 тысяч рублёў. Хоць гэта грошы невялікія, але хочацца быць упэўненым, што яны трапілі па прызначэнню.

Жадаю ўсім супрацоўнікам рэдакцыі добрага здароўя і поспехаў у працы на карысць нашай роднай Беларусі!

Адам ГУРЫНОВІЧ,
пенсіянер, 70 гадоў.
м.Старобін.

Ад рэдакцыі: Паколькі пытанні, узнятыя нашым шаноўным чытачом, маюць не толькі прыватны характар, мы вырашылі адказаць на іх праз газету.

Выступленні на мітынгах простым журналістам запісваць у цяперашніх умовах даволі складана. Гэта могуць толькі спецслужбы з іх адпаведна падрыхтаванымі кадрамі і дасканалай аўдыётэлетэхнікай, якая каштуе вялікіх грошай. Далёка не ўсё можа надрукаваць наша газета і з-за свайго невялікага памеру і перыядычнасці. Наша выданне разлічана хутчэй на аналітычную інфармацыю, чымся на разгорнутыя справаздачы. Тым не менш, мы абавязкова ўлічым чытацкія пажаданні і будзем больш падрабязна знаёміць са зместам выступленняў, а часткова і друкаваць некаторыя цалкам, як мы іншым разам, дарэчы, і рабілі, нягледзячы на тэхнічныя складанасці. А ў далейшым, калі ўсё ж неяк набудзем добрую тэхнічную і матэрыяльную базу, абавязкова знойдзем магчымасці больш поўна паведамляць пра ўсе важныя падзеі. Хоць і цяпер рэдакцыя імкнецца, каб чытач газеты меў поўнае ўяўленне аб грамадска-культурным жыцці беларусаў, у тым ліку замежжа.

Грошы Вашы, шаноўны Адам Мікалаевіч, паступілі на рахунак ТБМ. Дарэчы, зварот быў не рэдакцыйны, а Сакратарыята ТБМ, які ў бліжэйшы час абяцае апублікаваць прозвішчы тых, хто адгукнуўся на заклік аб матэрыяльнай падтрымцы. Прыміце і ад нас шчырую падзяку, шаноўны Адам Мікалаевіч. Карыстаючыся нагодай, просім усіх нашых чытачоў-сяброў знайсці магчымасць не толькі падпісацца на газету самім, але аформіць падпіску на «Наша слова» сябру, школе. Кошт падпіскі, дарэчы, значна таннейшы, чымся сапраўдныя выдаткі на выданне газеты. Мы гэта робім дзеля таго, каб газету маглі выпісаць школьнікі, студэнты, якім яна, спадзяёмся, будзе добрым дарадцам у вучобе і грамадзянскім, патрыятычным самавыхаванні.

Беларускі шлях

«Я не мог напіцца сваёй роднай мовы...»

Герой інтэрв'ю — самародак Міхась Басякоў, выхаваны ў сям'і на традыцыйнай беларускай культуры далёка за межамі этнічнай бацькаўшчыны — ў Сібіры. Ён не атрымаў сістэматычнай і прафесійнай адукацыі, але па багацці сваёй натуры, па адоранасці, розуму і энергіі здатны на вялікія справы. Дарэчы, сваю натуру Міхась Басякоў ужо паказаў. Ён нарадзіўся ў Екацярынбургу, дзе атрымаў сярэднюю адукацыю, адслужыў армію ў Казахстане, а затым, пасля дэмабілізацыі, нечакана для родных і сяброў, выехаў у Беларусь. Рашэнне выспявала доўгія гады. Паспрыяла сямейнае асяроддзе, знаёмства з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі ў Екацярынбургу, паездка на радзіму продкаў і іншыя акалічнасці. І хоць дома засталіся бацькі, сваякі, уладкаванасць і дабрабыт, а тут у яго, як кажуць , ні кала, ні двара, Басякоў упарта трымаецца за Беларусь. Ён разважыў, што менавіта тут яго месца. І што толькі тут яго духоўны багаж — спадчына па дзядах і прадзедах, — будзе запатрабаваны суайчыннікамі.

Унікальнасць Міхася ў тым, што беларуская мова для яго была і застаецца адзіным сродкам зносін з навакольным светам. На рускай мове ён не загаварыў у дзяцінстве — існавала нейкая ўнутраная перашкода. І ў школе, і ў арміі працягваў гаварыць па-свойму. Яго беларуская мова гутарковага тыпу — экспрэсіўная і дынамічная. Рэдкія русізмы ў моўнай плыні не ўспрымаюцца як зерні вульгарнай «трасянкі», а як адбітак мясцовага каларыту мовы сібірскіх беларусаў. Як аказалася, Басякоў выдатна выконвае найстаражытнейшыя беларускія балады («Пра Тугарыныча змея», «Як татары град палілі» і інш.), абрадавыя, салдацкія, гістарычныя песні, якіх ён ведае вельмі многа і якім немаведама колькі ўжо гадоў. У сваёй большасці гэтыя творы на Беларусі ўжо не бытуюць, і выходзіць, што Міхась застаецца іх адзіным носьбітам. Для спецыялістаў, якія вывучаюць аўтэнтычны фальклор, гэта несумненна ўяўляе вялікую цікавасць. Спявае Міхась грудным голасам, вібрацыяй надаючы гукам асаблівую афарбоўку і выразнасць. Манеру спеваў ён пераняў ад прабабкі Хвядоры і яе дачок — бабуль Алены, Матроны і Лісаветы. Усе яны былі выдатнымі спявачкамі і захавальніцамі традыцыйнай беларускай культуры. Ад іх таленавіты нашчадак пераняў і іншыя сакрэты беларускай даўніны — ткацтва, вышыўку, рукадзелле.

Кажуць, талент у чалавека ад Бога. Але далёка не кожнаму ўдаецца рэалізаваць патэнцыяльныя магчымасці свайго дару на карысць народа і радзімы. Невядомыя і незапатрабаваныя, таленты жывуць сярод нас — звычайных, шараговых абывацеляў, не ведаючы, на каго ім абаперціся і да каго прыткнуцца, каб не прапала тое, што носяць у сабе. Хочацца верыць, што лёс паспрыяе Махасю Басякову.

Гісторыя роду Міхася Басякова ў Сібіры

У XIX ст. з Беларусі ў Сібір насельніцтва мігрыравала двойчы: пасля паўстання Кастуся Каліноўскага, калі вывозілі сем'і паўстанцаў, і напрыканцы стагоддзя, калі хадакі далажылі, што зямля ў Сібіры дужа добра родзіць і даюць яе ўсім колькі хочаш, а ў лясах і азёрах багата пушніны, арэхаў, ягад, грыбоў, рыбы. Першай апынулася на сібірскіх прасторах пад Усць-Ішымам старэйшая сястра Міхасёвага прадзеда Івана Тодаравіча, жонка паўстанца Кацярына. Прабабка Хвядора з прадзедам, з Рагачоўскага павета, прыбылі туды пазней, з другой міграцыйнай хваляй, у тысячагаловым гурце. Як прыехалі на месца, у Цюменскую губерню, дык адразу ўтварылася шэсць беларускіх вёсак — Ярмакі, Асінаўцы, Ялоўка, Жыгулі і інш., якія існуюць і сёння. Жылі па суседству з прыбалтамі і чалдонамі. Мясцовыя жыхары чалдоны — мяшанцы па крыві, продкі плямён (печанегаў, хазараў і інш.), якія жылі ў данскіх стэпах і якіх яшчэ Ярмак Цімафеевіч загнаў у сібірскую глухамань. У іх скуластыя твары і дзіўная гаворка.

Спярша беларусы жылі ў зямлянках, наймаліся на працу да сваіх суседзяў, а потым займелі ўсё сваё, бо былі працавітымі людзьмі. Хвядора і Іван Тодаравіч пабудавалі хату-пяцісценку, вельмі вялікую, з прасценкамі і столлю — размаляванымі. Абзавяліся дойнымі каровамі, а коней у табуны гуртавалі. Аралі ўначы, бо ўдзень мошка заядала; косячы, абвязвалі твары хусткамі. Бульбу садзілі каля хаты, сеялі лён, вырошчвалі гарбузы, курузу і нават агуркі ў гнойных прадолінах, каб не вымярзалі.

У грамадзянскую вайну ацалелі. Праўда, Хвядора расказвала, што іх род тады раздвойваўся: адны стаялі за белых, другія — за чырвоных. Калі пачалося раскулачванне, многія ўцякалі на Амур і прадзеду казалі: «Хадзем, Іван Тодаравіч, з намі». А той адказваў: «Я тут застануся, бо не лічу за сабой нічога паганага». Прадзед быў добрым чалавекам, аўтарытэтным і паважаным. Сярод сваіх сібірскіх беларусаў быў і пісарам, і войтам. Купляў кнігі і любіў чытаць, сам прыдумляў вершы, якія пасылаў Дзям'яну Беднаму, з якім сябраваў. Аднаго разу на сядзібу прадзедаў у Ялоўку завіталі начальнікі. Агледзелі хату, хлеў, гумно і запісалі гаспадароў кулакамі.

Вывозілі іх зімою, у люты мароз. З бацькамі паехалі старэйшы сын Павел з нявесткаю, меншая дачка Матрона і паскробыш Іван — яго Хвядора нарадзіла ў 50 гадоў. Старэйшых замужніх дачок Лізавету і Алену бяда не зачапіла — жылі яны з сем'ямі ў Ярмаках. Не даязджаючы да Табольска, нявестка на возе нарадзіла дзіця. А тут сцюдзёна і малака няма. Малое не выжыла. Пахаваць не давалі. Кідай, казалі, у гурбу. Прадзед запратэставаў: «Пакуль не дасце пахаваць дзіця, нікуды не рухнемся!» Пахавалі.

У Табольску людзей запусцілі ў халодныя царскія казармы. А праз колькі дзён пагналі вялікай чаргой на Салехард. Нанач табарыліся ў полі. Раніцай падымуцца — уся зямля ўсцелена трупамі. Збяруць іх, закапаюць і ідуць далей.

На Салехардзе валілі лес. Прабабка Хвядора — а была яна жанчынай ахайнай, ва ўсім любіла парадак — зарабляла ягадамі. Пойдзе, бывала, у балота, назбірае журавін і брусніц і ў чыстым фартушку паднясе іх да парахода на раку Об. У іншых, каравых і чорных, ягад не бяруць, а ў яе ўсё расхапаюць. Муку куплялі і хлеб пяклі з тырсай — дробнымі бярозавымі апілкамі. Малыя дзеці крадком, бо не давалі, лавілі рыбу. Паскробыш Іван пазней расказваў: «Едуць аб'ездчыкі, хочуць нас злавіць, а мы, дзеці, — шусь у тайгу. Варочаемся дадому з рыбай. Старэнькія бабулькі на вуліцы сядзяць, хочуць есці. Кінем ім рыбку». Пажылі на Салехардзе і ўбачылі, што трэба ўцякаць. Першым пабег Павел. Падхапіў на параходзе дызентэрыю і памёр. Тады пабеглі меншыя дзеці — Матрона і Іван. Маці дала ім хустку-гаруску і наказала пакласці яе на алтар у царкве. Яны так і зрабілі. Таму ім Бог дапамог. На параходзе плылі — елі шалупінне, жабравалі. Потым пайшлі, хаваючыся, праз татарскія сёлы. Людзі паўсюль чужыя, могуць і назад вярнуць. Пад Усць-Ішымам селі адпачыць. Тут і знайшла іх старая Кацярына, бацькава сястра — жонка таго беларускага паўстанца, і забрала да сябе. Праз колькі дзён яны пайшлі дамоў — у Ярмакі і Ялоўку, бацькавай хаты ў дварыўжо не было — перавезлі ў Вікалава. Хвядора і Іван Тодаравіч вярнуліся са ссылкі ў 35-ым. Паставілі невялічкую хатку, прыкупілі карову, парасят, развялі пчол. Зноў пачалі жыць па-людску, а тут іх гоняць у калгасы. А быў там гвалт і вэрхал. Хвядора не вытрымала і аднойчы сказала на сходзе: «Вашу савецкую ўладу трэба лыкам зашыць і па-старому жыць». Неўзабаве прыехалі энкэвэдзісты і забралі Івана Тодаравіча, а з ім яшчэ васьмярых мужчын — былых ссыльных. Усе яны як у ваду канулі. Хацелі арыштаваць і Хвядору, але тая на балоце журавіны збірала, дык не знайшлі.

— Скажыце, Міхась, а з якога часу Вы спяваеце?

— Змалку. Бывала, мае бабулі, сярод якіх гадаваўся, збіраюцца разам, каб паспяваць — і я з імі. Выключна спявала мая прабабка. Сто восем гадоў пражыла, памерла ў 1971 годзе і да астатняга спявала. На свята падымала першую чарку і казала:

А я панскага роду,
П'ю гарэлачку, як воду —
Па тры чаркі на глыток,
Увалюся ў куток.

І яе дочкі, Матрона, Алена, Елісавета (мая родная бабуля), былі галасістымі. Бывала, як падымуць галасы, здаецца, хата раскоціцца, разыдзецца. Ад іх я пераймаў усе спевы, усе нашы старавінныя родавыя песні. Нашы балады асабліва цягучыя і цяжка даюцца на голас. Я найбольш прагнуў іх слухаць і спяваць. Мне нашы казалі: «Табе трэба было нарадзіцца сто гадоў назад». А ў школе празвалі дзедам Міхасём.

— Ці маеце Вы запісы сваіх родавых песень?

— Я іх не запісваў. Я вывучаў іх толькі па голасу. Гэта ўсё, што я ведаю. А запісаць іх слова ў слова не змагу, нават каб і хацеў.

— Дзе Вы свае песні спяваеце?

— Толькі ў вузкім коле. Не ўсе іх разумеюць. Нават мае сваякі, што ў горадзе аселі, імі не цікавяцца.

— Значыць, не ўсе з Вашага роду трымаюцца за беларускую культуру?

— Каб хоць адзін з іх! Цягучых нашых песень зараз ніхто і ў Сібіры не спявае.

— А на сваёй мове яны там гавораць?

— Хто ў Екацярынбургу жыве, — тыя цураюцца. Дома скажуць слова, а на людзях саромеюцца.

— Ну, а вось Вы ж гаворыце — усюды і з усімі — па-беларуску?

— Я не магу інакш. У школе з першага класа за мяне ўзяліся настаўнікі. Бацькоў выклікалі: «Чаму гэта Ваш хлопец не гаворыць па-руску? Яго трэба перавучваць». Адправілі да лагапеда — не дапамагло. У 4-ым класе выкладчыца рускай мовы зноў паспрабавала мяне перавучыць, а я як гаварыў, так і гавару па-свойму. Аднойчы мая настаўніца спытала: «Колькі ты яшчэ будзеш гакаць?» «Колькі буду жыць, столькі і буду гакаць», — адказаў я. Што тут пачалося! Выклікалі бацьку, маці, з усіх бакоў на мяне націснулі, да слёз давялі. У дзевятым класе не вытрымаў і пажаліўся дырэктару Куліковай. Больш мяне не чапалі. У дзесятым класе здаваў экзамены па рускай літаратуры. Цытую твор Пушкіна і гакаю, вядома. Настаўніца за галаву схапілася, а дырэктар кажа: «Ты, Міхаська, прачытай нам лепей які-небудзь беларускі верш». Я і прачытаў:

Парадніліся не па прымусу —
Па размаху сваёй дабрыні.
Беларусы, мае беларусы,
Па крыві, па ідэі браты.
Хлапчукоўскімі бачу вачамі
Сіні край, што нідзе не забыў:
Не па кніжках яго завучыў я,
Не па фільмах яго палюбіў.
Вёска родная няньчыла мала,
Ды ў гады не ўкладзецца туга.
І гаворка мая захавала
Беларускае мяккае «га».
Мова, што не даруе абразу,
Ёй рашучасці не пазычаць:
Па бацькоўскаму складу адразу
Можа цвёрдай гаворкаю стаць.

— Адкуль Вы ўзялі гэты верш?

— Запісаў ад знаёмага беларуса з Екацярынбурга. Прозвішча аўтара не ведаю.

— Што Вас яшчэ цікавіць, акрамя народных песень?

— Усё, што робіцца рукамі. Прабабка Хвядора вучыла: «Зробленае сваімі рукамі, носіш ты яго ці маеш пры сабе — ахоўвае ад благога». Колісь яна дала свайму паскробышу Івану старадаўні, яшчэ ад бабулі Марфы, ручнік, вытканы ўзорам на падабенстве свастыкі. З гэтым ручніком Іван усю вайну прайшоў і зараз жыве. Ручнік бараніў ад смерці. Зараз гэты ручнік захоўваецца ў мяне.

— Вы вышываеце?

— Толькі крыжыкам, і толькі ручнікі.

— А тэхніку ткацтва ведаеце?

— Ведаю. Падмагаў дома ткаць ручнікі, абрусы, дываны. У нас яшчэ ткалі кулёўкі на ткацкім станку. Гэта такія радзюгі-мяхі. Іх прадавалі па рублю за штуку. Дзеці вучыліся, а за вучобу трэба было да вайны плаціць. Вось і выкручваліся бацькі, як маглі.

— А з чаго ткалі кулёўкі?

— З мачалы, з лубянога слоя ліповай кары.

— Як Вы вырашылі пераехаць на Беларусь?

— Мяне на бацькаўшчыну продкаў заўсёды цягнула, як магнітам. Хацелася стаць на калені перад ракой Басяй, ад якой і пайшло прозвішча Басяковы. У IX-м класе я паехаў на Шклоўшчыну. Жыў у вёсцы Забалацце і, ведаеце, не мог напіцца сваёй роднай мовы. Усе гавораць навокал па-беларуску. Мне было так усцешна, лёгка пасля Сібіры, я адчуваў сябе такім разняволеным — сваім сярод сваіх. І ў мяне тады склалася думка, што я павінен жыць толькі на Беларусі і толькі ў вёсцы. Хацелася даіць кароў. Пасля школы год правучыўся ў сельгасінстытуце. Адтуль забралі ў армію. Служыў на Байкануры. Навокал стэпы, а я сын балотаў ды лесу. Прывязуць, бывала, дровы на распалку, я вазьму палена, прытулюся да кары і дыхаю яе водарам. Мне сніліся бярозкі. Праз восем месяцаў службы купіў гармонік і з хлопцамі з роты стварыў самадзейны ансамбль. Пашыў спадніцы, шнуроўкі, фартухі, упрыгожыў іх тасьмою — атрымалася беларускае нацыянальнае адзенне.

— У ансамблі былі беларусы?

— Былі беларусы, украінцы, рускія. Хлопец, голас якога падыходзіў да майго, у шнуроўцы і гарнай спадніцы, быў з Браншчыны. А бранскія і смаленскія хлопцы такія ж беларусы, гутарка іх гэткая, як і ў нас.

— Вы іх навучылі беларускім песням і танцам?

— Навучыў усяму, што ўмеў сам.

— А выступалі з поспехам?

— З вялікім поспехам. Пасля першага канцэрта на сцэну выйшла прыгожая жанчына і сказала: «Ведаеш што, Міхась, я украінка, але ўжо адвыкла ад сваёй культуры. Вы мне нагадалі маё. Вашы беларускія песні і танцы падобныя да нашых і такія ж гарныя. Дзякую табе і прымі напамяць маю хустку».

— Калі Вы пераехалі на Беларусь?

— Адразу, як вярнуўся з арміі. 14 лютага 1987 года ўжо даіў кароў у калгасе «Добры бор» пад Баранавічамі. Далі мне пустую хату. Я завёў сваю гаспадарку — адных авечак ды коз даходзіла да сарака галоў. Сем гадоў быў даяром і ўсё кінуў.

— А чаму?

— Бо пачалося знішчэнне калгаснага статка. З 800 галоў засталося мо 300. Не было чым карміць жывёлу, бо перасталі даваць камбікорм на ферму. Так не стала мне работы.

— Я чула, Вы стварылі песню пра Улада Лісцева, калі яго забілі, проста на радыёстудыі?

— Сама з грудзей вызвалася, не ведаю адкуль што і ўзялося. Мяне падняло і панясло некуды. Забыўся аб усім. Скончыў спяваць у нейкім ап'яненні.

— І заўсёды, калі спяваеце, упадаеце ў такі стан?

— У асноўным так. І не ведаю, што гэта такое.

— Скажыце, ці даводзілася Вам калі чуць на Беларусі вашы родавыя песні?

— Чуў водгаласы некаторых абрадавых песняў — вясняных, вясельных, радзільных, а балады — дык не, ніколі.

— А як Вы запісаны ў пашпарце — рускі(?) беларус?

— Пры савецкай уладзе нас усіх, сібірскіх беларусаў, як авечак, пазапісвалі рускімі. Пры Гарбачове, калі стала вальней і перасталі мы гэтай улады так баяцца, многія паспрабавалі памяняць нацыянальнасць — перапісацца на беларусаў. Нашы екацярынбургскія начальнікі адмовілі: паслалі за дазволам у Маскву.

— Міхась, Ваша жыццё на Бацькаўшчыне складваецца не зусім добра. Жадаю Вам пераадолець усе цяжкасці і дзякую за гутарку.

Распытвала Ірына КРЭНЬ.

Меркаванні

Зноў пра Літву і Летуву

З цікавасцю чытаю ў «Нашым слове» нарыс У.Свяжынскага «Беларуская мова». Але здзівіла яго тлумачэнне назвы Вялікага Княства Літоўскага («НС» № 16). Вось яго сутнасць: летувіскі князь Міндоўг заснаваў новую дзяржаву — будучае Вялікае Княства Летувіскае, Рускае, Жамойцкае. Наваградская зямля разам з суседнімі летувіскімі стала ядром Летувіскага Княства. У склад Летувіскай дзяржавы ўвайшла Полацкая зямля...

Чаму да азначэння беларускалітоўскай дзяржавы аўтар ужыў назвы Летува, летувіскі, якія ў апошні час звычайна ўжываюцца ў значэнні этнічная Літва, літоўцы? Як вядома, у дарэвалюцыйнай і савецкай навуковай літаратуры існавала тэорыя аб завяванні этнічнай Літвой (літоўцамі) беларускіх зямель і яе жыхароў. Тады такое сцвярджэнне аўтара апраўдваецца.

Але працы сучасных беларускіх навукоўцаў (што таксама вядома) гэтай тэорыі не пацвярджаюць, даказваюць іншае, нават адваротнае. На маю думку, ёсць усе падставы гаварыць пра дзве Літвы. Адна гістарычная, на беларускіх землях, якая стала цэнтрам новай дзяржавы, дала ёй назву, а жыхарам назоў літвіны-беларусы, а не літоўцы. У «БелСЭ» (т.1) на карце ВКЛ у XIII—XV стст. няма Літвы, ёсць Жмудзь і Аўкштайція. У апошнюю, паводле дадзеных К.Тарасава («Памяць пра легенды»), уваходзілі землі Нальшан, Дзяволтвы і ўласна Літвы ў міжрэччы Нёмана, Вілii і Мерачанкі. Гэта другая этнічная Літва (Летува). Па вызначэнні М.Ермаловіча старажытная Літва знаходзілася на тэрыторыі ад Маладзечна да Слоніма, ад Менска і Ляхавіч да Наваградка. У нечым падобнае паясненне ёсць у «БСЭ» і «Бел. кароткая энц.» (т. 1, 1979 г.): «Літва, рус. назва ўсходне-балт. плямён, пражываючых на тэрыторыі Усход. Літвы, у паўночных раёнах Верхняга Панямоння і Падняпроўя» ...Яна ў XII—XIII стст. была каланізавана славянамі, а балты асіміляваны. У артыкуле У.Свяжынскага ёсць выраз: «У Вялікім Княстве Летувіскім назва «Летува» адносіцца да верхняга і сярэдняга Панямоння». Гэта таксама ўскосна даказвае існаванне Літвы гістарычнай і этнічнай асобна.

Аўтары «100 пытанняў і адказаў...» пішуць, што з гістарычнай Літвы (каля Баранавіч) прыйшоў Міндоўг у Наваградак і стаў князем, затым «зане Літву» («Іпацьеўскі летапіс»), але не здолеў утрымаць. Толькі сын яго Войшалк канчаткова яе заваяваў у 1263—64 гг. «и поча вораги свае избивати...» «Адсюль, з верхняга Панямоння, дзе знаходзілася старажытная Літва, і пайшла назва новай дзяржавы». У кніжцы «Праз смугу стагоддзяў» В.Чаропка паведамляе, што назва заходняй Беларусі (Верхняе Панямонне, Наваградчына, Гродзеншчына, землі каля Крэва і Ашмян), па думцы некаторых гісторыкаў, прыйшла сюды з тэрыторыі сучаснай Літвы ў часы ВКЛ. Але гэта абвяргаецца запісам у Густынскім летапісе, што ў 1128 г. «посла Мстислав во Литву ко Изяславлю всея князей». Гэта значыць у Літву пад Заслаўем каля Менска ды больш чым за сто гадоў да ўзнікнення ВКЛ. Аўтар выказаў думкі і аб славянскіх імёнах літвінаў-князёў. А.Літвіновіч у сваім артыкуле ў «Нашым слове» № 31 пераканаўча даказвае, што Міндоўг служыў славянам, літвінам-беларусам, а не Летуве і летувісам. Многія нашы грамадзяне не прызнаюць беларускі характар Вялікага Княства Літоўскага, таму я рашыў выйсці за рамкі толькі пытання да аўтара нарыса.

Міхаіл ПУЗІНОЎСКІ.
гор. Ашмяны.

В Е Р У Е М

Сустрэча з Богам твар у твар

«Абраз, ікона[1] — твор станковага жывапісу, які мае культавае прызначэнне». Такое сухое азначэнне дае першы том «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва». А між тым абраз, ці, калі карыстацца царкоўнаславянскімі тэрмінамі — ікона, гэта з'ява, якая ўбірае ў сябе і мастацтва, і культуру, і рэлігію. І найперш — рэлігію. Вядомы багаслоў Пётр Флярэнскі назваў царкоўнае дзейства «сінтэзам мастацтваў», бо яно звяртаецца да ўсіх бакоў чалавечай асобы. Вобраз, таемства і слова ёсць складаючыя царкоўнага богаслужэння. І вось ікона і павінна адыгрываць ролю гэтага вобраза. Вобраза Бога. Існуе выказванне аднаго вядомага вучонага пра знакаміты абраз Андрэя Рублёва: «Тройца» Рублёва — гэта сустрэча з Богам «твар у твар».

Пазнаёмімся з гісторыяй шанавання святых іконаў з дапамогай «Беларускага праваслаўнага календара». Згодна царкоўнаму паданню першыя іконы ўзніклі пры жыцці Самога Збавіцеля. Цар Аўгар з горада Эдэса паслаў жывапісца, каб ён намаляваў падобны да Госпада вобраз. Але жывапісец не змог гэта зрабіць з прычыны вялікага ззяння вакол Яго Асобы. Тады сам Гасподзь прыклаў кавалак тканіны да свайго Боскага Твару і, зрабіўшы адбітак на гэтай тканіне Свайго вобраза, паслаў яго Аўгару. Згодна другому паданню, святы апостал і евангеліст Лука напісаў першыя абразы Божай Маці, святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла.

Пачатак абгрунтавання іконашанавання пакладзены VI Усяленскім Саборам (691—692 гг.). 82-е правіла гэтага Сабора абвяшчае: «...загадваем адгэтуль вобраз Агнца, бяручага грахі свету, Хрыста Бога нашага, на іконах прадстаўляці па чалавечай існасці». Правіла гэта было адказам на існуючае ў той час становішча, калі ў царкоўнай практыцы, побач з гістарычнымі вывамі, ужываліся сімвалы, якія замянялі чалавечы вобраз Бога. 100-е правіла таго ж Сабора таксама з'яўляецца вяхою ў фармаванні метаду іканапіснага мастацтва. Яно абвяшчае: «Выявы, якія разбэшчваюць розум і распальваюць нячыстыя задавальненні, не дазваляем адсюль якім бы тое ні было спосабам маляваць». Царква паступова стварыла новае мастацтва — іканапіснае, якое ў сваіх вобразах, з аднаго боку, захоўвае рэальнасць форм, а з другога боку, вобразы гэтыя не маюць пачуццёвасці, узвышана аскетычныя.

Іконашанаванне стала агульнапрынятым у VI—V стагоддзях. Аднак у VIII стагоддзі з прычыны палітычных меркаванняў грамадзянская ўлада пачала знішчаць іконашанаванне наогул. Так утварылася іканаборская ерась.

Пасля працяглай барацьбы ўсталяваннем VII Усяленскага Сабора (787 г.) іконашанаванне было ўзноўлена. Перамога над іканаборствам і ўзнаўленне іконашанавання былі агалошаны Пераможнасцю Праваслаўя і святкуюцца ў першую нядзелю Вялікага Посту. Догмат, прыняты святымі айцамі VII Усяленскага Сабора, абвяшчае: «Падобна выяве Праўдзівага і Жыватворнага Крыжа пакладаць у святых Божых Цэрквах, на свяшчэнных сасудах і адзежах, на сценах і дошках, у дамах і на шляхах, праўдзівыя і святыя іконы... Бо пашана, якая аддаецца вобразу, пераходзіць да першавобразнага, і той, хто пакланяецца іконе, пакланяецца існасці выяўленага на ёй». Тым самым ікона прыраўноўваецца да Святога Пісання і Крыжа як адна з форм святога адкрыцця і богапазнання.

А вось што пісаў пра іконашанаванне пратаіерэй Аляксандр Мень: «Асноўны аргумент, якім карысталіся і карыстаюцца праціўнікі іконашанавання, — спасылка на біблейскую забарону рабіць выявы Бога (Кніга Сыходу, 20, 4). Сэнс забароны не выклікае сумненняў. Існы бясконцы, Ён вышэйшы за ўсё зямное, таму любая спроба зрабіць Яго выяву мяжуе з блюзнерствам і можа паслужыць узнікненню ідалапаклонства. Так было да Хрыста, але ў новазапаветны час Бог ужо не толькі — Патаемны і Неспаведны. Ён яўлены людзям у таемстве Увасаблення. Сама рэальнасць Ісуса Хрыста як Богачалавека апраўдвае Яго выяву. Вобраз Таго, Хто жыў на зямлі, Каго бачылі і чулі людзі, Хто быў не толькі Богам, але і чалавекам, несумненна можа быць адлюстраваны і сродкамі мастацтва.

Зразумела, гэта яшчэ з большым правам трэба аднесці да іконаў святых. Адносіны глыбокай пашаны да іконы ёсць ушанаванне яе першавобраза. Яна дапамагае засяродзіцца, скіроўвае ўвагу чалавека на прадмет малітоўнай развагі. Словам, яна ідзе насустрач натуральным запатрабаванням душы. Калі маці можа ў думках размаўляць з памерлым сынам, гледзячы на яго партрэт, дык цалкам зразумела, што малітоўнаму звароту да Хрыста, Прачыстай Дзевы і святых спрыяюць іх вобразы, намаляваныя рукой мастака».

На Беларусі існавала самабытная нацыянальная жывапісная школа пач. 16—пач.19 ст. Яна склалася на аснове традыцый візантыйскага і старажытнарускага мастацтва пад уплывам ідэй Адраджэння. Творы беларускай іканапіснай школы вызначаюцца вернасцю канону, умоўнасцю і сімвалізмам выяўленчай мовы, характэрнасцю тыпажу, шырокім выкарыстаннем этнаграфічных элементаў, імкненнем адлюстраваць навакольную рэчаіснасць. Адметная рыса беларускіх абразоў — узорыстасць, багатая і разнастайная арнаментоўка, розны раслінны арнамент фону, мажорнасць агульнага нацыянальнага ладу. Беларускія майстры іканапісу стварылі шмат цудоўных абразоў — мастацтвазнаўцы называюць «Маці Божую Адзігітрыю» са Случчыны (16 ст.), «Нараджэнне маці Божай» Пятра Яўсеевіча з Галынца (17 ст.), «Выбраныя святыя — Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Златавуст» з Брэстчыны (2-я палова 18 ст.) і шмат іншых. З многімі з іх мы можам пазнаёміцца ў мастацкіх музеях. Выдадзены асобнымі выданнямі альбомы беларускіх абразоў. Але з пункту гледжання рэлігіі — якія іконы найбольш шануюцца на Беларусі?

Найперш гэта — **Жыровіцкая ікона Божае Маці**. Яна з'явілася ў 1470 годзе ў мястэчку Жыровіцы, што на Гродзеншчыне. У лесе праваслаўнага літоўскага баярына Аляксандра Солтана пастухі заўважылі незвычайна яркае святло, якое струменілася праз галінкі грушавага дрэва. Падышоўшы бліжэй, пастухі ўбачылі на дрэве невялікую ікону Божае Маці ў прамяністым ззянні. Яе аднеслі да баярына, і ён зачыніў Ікону ў куфэрак. На наступны дзень да Солтана прыйшлі госці, і гаспадар вырашыў паказаць знаходку. Але іконы ў куфэрку не аказалася. Праз нейкі час пастухі ізноў знайшлі яе на тым самым месцы. На гэты раз Аляксандр Солтан паставіўся да іконы з глыбокай пашанай і збудаваў на месцы яе з'яўлення царкву ў гонар Прасвятой Багародзіцы. Каля 1520 года храм згарэў. Праз нейкі час сялянскія дзеці ўбачылі дзівоснае відовішча: Дзева надзвычайнага хараства ў прамяністым ззянні сядзела на камені, трымаючы ў руках ікону, якую лічылі згарэлай. Жыхары мястэчка на чале са святаром накіраваліся да таго месца і знайшлі там на камені не пашкоджаную ікону. Пазней вакол адбудаванага храма паўстаў мужчынскі манастыр.

Жыровіцкая ікона Божай Маці ўшаноўвалася і уніятамі, і каталікамі. Цяпер яна знаходзіцца ва Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра і глыбока шануецца за яе дабрадатную моц. Ікона выразана на камені і лёгка змяшчаецца на далоні.

У Менскім кафедральным Свята-Духавым саборы, злева ад галоўнага іканастаса, знаходзіцца ікона, якая лічыцца заступніцай Менску. Гэта **Менская Ікона Божае Маці**, якая мае шматвяковую гісторыю. Паводле царкоўнага падання яна была напісана апосталам евангелістам Лукой і шмат гадоў знаходзілася ў Візантыі. На Русь яе прывезла сястра візантыйскіх імператараў Ганна, якая выйшла замуж за кіеўскага князя Уладзіміра. Падчас узяцця Кіева крымскім ханам Менглі-Гірэем адзін з татараў садраў з іконы каштоўную аправу, упрыгожанні, а сам абраз кінуў у Днепр. Гасподзь захаваў яе. Ікона была знойдзена ў нашым горадзе, яна плыла па рацэ Свіслач, прыстала да берага і свяцілася незвычайным святлом. Яе перанеслі ў царкву Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы на Замчышчы. Гэта было 13 жніўня 1500 года. Пасля ікона знаходзілася ў Петрапаўлаўскім Саборы, які ў 1937 годзе быў разбураны. Але святы абраз зноў захаваўся. Ікона знаходзілася ў дрывяным складзе непадалёк ад Дома афіцэраў. Пад час Вялікай Айчыннай вайны яе знайшлі там і змясцілі ў Свята-Екацярынінскую царкву. У 1945 годзе, пасля закрыцця Свята-Екацярынінскай царквы, ікона была перанесена ў кафедральны Свята-Духаў сабор, дзе знаходзіцца да сённяшняга дня.

Бялыніцкая ікона Божае Маці з'яўляецца агульнай святыняй хрысціян Беларусі. Яна была напісана ў XIII ст. Спачатку знаходзілася ў адным з праваслаўных храмаў Магілёўскай вобласці. Пасля заключэння уніі (1596) ікона перайшла да каталікоў і была пастаўлена ў касцёле каталіцкага манастыра ў 45 вёрстах ад Магілёва. Ікона ўшаноўвалася як каталікамі, так і праваслаўнымі. З 1876 года Бялыніцкая ікона Божае Маці зноў знаходзіцца ў праваслаўным храме.

У кожнай хрысціянскай сям'і павінны быць іконы, абразы. Яны павінны знаходзіцца на покуці — у «чырвоным», пачэсным куце. У першую чаргу тут павінны быць іконы Збавіцеля, Божай Маці і святых, чые імёны носяць тыя, хто жыве ў гэтым доме. Пажадана, каб тут жа вісела і лампадка.

Ікона абавязкова павінна быць асвечаная царкоўнай малітваю і святой вадою. Калі абраз набыты ў царкве — ён ужо асвечаны. Калі не — яго трэба асвяціць. Пісаць іконы можа толькі чалавек веруючы, уцаркоўлены, які ведае строгія царкоўныя каноны іканапісу.

Л.Ш.

[1] Ужыванне тэрмінаў «ікона» і «абраз» у беларускай мове дасюль не ўнармавана. Але прынята ўжываць тэрмін грэцкага паходжання «ікона» ў кантэксце рэлігійным, «абраз» — у кантэксце «свецкім».

Дэсанка МАКСІМОВІЧ

Размова манахіні з Богам

Божа,
дабротаў пакінутых сэрца не прагне,
І летуценіць не ўмее пра шчасце зямное.
Ведаю — я ні над кім узвышацца не ў стане —
Добры і злодзей, багач і жабрак —
нада мною.
Нават і хвілі спакойнай яшчэ не пражыла,
Каб пагадзіцца, што я заслужыла такую...
Золата зорнае
шчасце маё аплаціла —
Зорку адзіную ўбачу —
і я не сумую.
Боль спасылаеш —
пакорліва толькі схілюся,
Кожны свой крок павяраю, баюся —
зграшыла.
Кожнаму ў свеце Тваім я стварэнню
дзіўлюся —
Нават у дробнасці дробнай —
Вышэйшая Сіла...
Ты зажадаеш —
і траплю злачынцам у крыўду,
І незаслужаны грэх выкупляць буду
строга...
Люба пакутваць, калі мне пакуты дарыў
Ты,
Люба мне ўсё,
што даецца мне праведным Богам.

Голас манахіні

Прыемна маўчаць.
Я — ніва, што дрэмле пад снегам,
Я — зерне, схаванае ў ёй,
каб вясной абуджацца,
Віхуры шалёныя не адгукаюцца рэхам
У сховішчы гэтым,
далёкім ад тлуму і жарсцяў.
Не ведаю, ці прамінаюць стагоддзі,
ці хвілі.
Мяне аніхто не пытаецца —
я не пытаю.
Так камню спакойна,
што ціхія травы спавілі,
Так добра таму,
хто пад каменем тым спачывае.
Цяпер я спакойна гляджу на падзеі і лёсы,
На ўсё, што калісьці было між людзямі і
мною —
І стол, за якім
і смяялася мне, і пілося,
Пяшчотную руку...
Забытыя словы мілосці...
Цяпер я спагадна гляджу,
як з далёкага раю,
Праз келлі вузенькую шыбу
на жарсці людскія,
Якімі калісьці і я сваё сэрца карала,
Пакінула там, дзе жыла,
назаўсёды якія...
Нікому расказваць я болей не маю нічога,
І тое, што б мне расказалі,
мне чуць не належыць.
Я — ніва, якая
захоўвае зернейка Бога,
І ветра не чуе,
і шчасцю не ведае межаў.

Пераклад з сербскай
Людмілы РУБЛЕЎСКАЙ.

Вучымся

Прозвішчы на -еня (-эня)

У «Нашым слове» № 33—34 за гэты год была змешчана зацемка Аляксандра Пятрова «Чаму такія прозвішчы?», дзе аўтар цікавіцца паходжаннем прозвішчаў з канцавым фармантам **-еня (-эня) — Мікалаеня, Сушчэня, Цярэня**... Паспрабуем адказаць яму.

Кароткія звесткі пра гэты ўласцівы толькі беларусам тып прозвішчаў можна знайсці ў выданні: Бірыла М.В. Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў. Мн., 1963, а таксама ў не так даўно выдадзенай навукова-папулярнай кніжцы Васіля Шура «З гісторыі ўласных імёнаў» (Мн., 1993).

Суфікс **-ен-я (-эн-я)** з'яўляецца патранімічным, г.зн. з яго дапамогай утварыліся назовы дзяцей паводле імёнаў ці мянушак бацькоў: **Міхал — Міхаленя, Пратас — Пратасеня, Яраш — Ярашэня, Кароткі — Каратчэня, Сіплівы** (ад **сіплы**) **— Сіплівеня**. Паходжанне і значэнне гэтага суфікса стане зразумелым, калі мы параўнаем яго з суфіксам **-ян-я** ў агульных назоўніках кшталту **птушаня, кацяня, дзіцяня**.

Прозвішчаў на **-еня (-эня)** на Беларусі не так і шмат: паводле Мікалая Бірылы, у цэлым іх доля складае 1%. Гэты ж даследнік акрэслівае таксама арэал іх найбольшага пашырэння — рэгіён Случчыны, Піншчыны. У іншых мясцовасцях яны рэдкія ці адсутнічаюць зусім. Напрыклад, аўтарам гэтых радкоў два гады назад былі запісаныя прозвішчы жыхароў 17-і населеных пунктаў Навагрудчыны, і там на 4208 апытаных чалавек прыйшоўся толькі адзін носьбіт прозвішча на **-еня**, што яскрава сведчыць пра нехарактэрнасць антрапонімаў такога тыпу для даследаванага рэгіёна.

Увогуле ж, гэтыя самабытныя беларускія прозвішчы вартыя асобнага падрабязнага даследавання, якое, спадзяёмся, будзе здзейснена.

Сяргей БОГУШ,
аспірант кафедры
мовазнаўства
Гарадзенскага
дзяржуніверсітэта
імя Янкі Купалы.

ACADEMIA «NS»

Гісторыя моваў на Беларусі

Уладзімір СВЯЖЫНСКІ,
кандыдат філалагічных навук

Беларуская мова

(Працяг.)

«Нельга прыступіць да сацыяльнага вытлумачэння літаратурнай мовы, пакуль не вывучана яе непасрэднае асяроддзе, г.зн. астатнія тыпы пісьмовага цыкла і ўсе разнавіднасці гутарковага маўлення гарадскога калектыву».
Барыс ЛАРЫН. Да лінгвістычнай характарыстыкі горада.

Як разумеліся ў Вялікім Княстве



Наддыялектныя формы існавання. Мы разгледзелі сістэму функцый (функцыянальную парадыгму) вышэйшай формы існавання мовы — яе літаратурнай формы. Аднак літаратурная мова — не адзіная форма існавання любой мовы. Гэта форма, найбольш функцыянальна нагружаная. Яе рынцыповае адрозненне ад іншых форм — кадыфікаванасць, наяўнасць пісьмовай разнавіднасці. Побач з літаратурнай мовай заўсёды суіснуюць шэраг іншых форм. З іх бліжэйшымі да яе па сваіх прыкметах з'яўляюцца рознага роду наддыялектныя формы, з якімі менавіта наддыялектнасць яе і аб'ядноўвае. З другога боку, вусны характар бытавання аб'ядноўвае наддыялектныя формы з тэрытарыяльнымі і сацыяльнымі дыялектамі. Супастаўляючы гістарычныя лёсы дыялекта і наддыялектных форм, можна сцвярджаць, што наддыялектныя ўтварэнні з'яўляюцца дынамічнай, прагрэсіруючай катэгорыяй. **У змене моўных сітуацый, якая характарызуе функцыянальную гісторыю любой мовы, узаемадзейнічаюць усе кампаненты функцыянальнай парадыгмы, аднак вядучая роля належыць у гэтых працэсах наддыялектным формам**. Вывад феадаламі як найболш адукаваным слоем грамадства з паўсядзённага ўжытку беларускай мовы ў якасці народна-гутарковай пацягнуў за сабой заняпад старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы, г.зн. выцясненне яе польскай мовай з цэнтра сацыяльна-камунікатыўнай сістэмы на яе перыферыю.

Складанасць рэканструкцыі наддыялектных форм існавання старажытнага перыяду любой мовы заключаецца ў тым, што гэтыя формы **не дадзены нам у непасрэдным назіранні нават у тых выпадках, калі разглядаюцца моўныя адносіны параўнальна недалёкага мінулага**. Таму гэтая рэканструкцыя праводзіцца гіпатэтычна, на аснове комплексу не толькі прамых, але і ўскосных дадзеных. Бо без уяўлення, хаця б і няпоўнага і дыскусійнага, адносна вусных форм зносін, якія бытавалі ў мінулым у таго ці іншага народа, практычна неажыццявіма пабудова функцыянальных парадыгмаў (г.зн. сістэм функцый моўных утварэнняў і моў) і апісанне моўных сітуацый, тым больш што дыферэнцыяльныя прыкметы разнастайных пісьмовых форм таксама раскрываюцца толькі ў суадносінах з іншымі кампанентамі функцыянальных парадыгмаў. Бясспрэчна, ступень дакладнасці рэканструюемых адносін вар'іруецца ў залежнасці ад характару матэрыялу, які маецца ў распараджэнні мовазнаўца, аднак наўрад ці можна пагадзіцца з нігілістычнымі адносінамі да рэканструкцыі функцыянальных парадыгмаў у магчыма поўным аб'ёме.

Вызначэнню межаў стыляў літаратурнай мовы і вусных наддыялектных форм існавання ў адносінах да беларускай мовы старажытнага перыяду ўскладняецца надзвычай высокай варыятыўнасцю сродкаў літаратурнай мовы, незавершанасцю працэсу фармавання сістэмы яе стыляў. Бо прадстаўнікі розных канфесій па-рознаму ставіліся да паняцця «норма» літаратурнай мовы: праваслаўны мог лічыць парушэннем нормы ўжыванне паланізмаў і наадварот, каталік лічыў парушэннем нормы ўжыванне царкоўнаславянізмаў, своеасаблівымі былі погляды на нормы літаратурнай мовы і ў прадстаўнікоў іншых канфесій (пратэстантызму і уніяцтва). Між тым, высокая апрацаванасць літаратурнай мовы магла б служыць шкалой для вызначэння іншых, наддыялектных форм існавання па ступені аддаленасці іх ад унармаванай літаратурна-пісьмовай мовы. **Дыферэнцыяцыя пісьмова-літаратурнай мовы і наддыялектных форм існавання ўскладняецца**, такім чынам, невыразнасцю межаў літаратурнай мовы, якія ўключалі і элементы іншых форм існавання. Нагадаем, што паколькі ў мове старажытных пісьмовых помнікаў адсутнічаюць многія з тых прыкмет, якія з'яўляюцца вызначальнымі для літаратурных моў сучаснасці, некаторыя даследчыкі наогул адмаўляюць правамернасць ужывання тэрміна «літаратурная мова» ў адносінах да ранніх эпох у развіцці пісьменнасці. Між тым, вылучэнне наддыялектных форм неабходна як для саміх гэтых форм, так і для таго, што ў процілстаўленні іншым формам існавання мовы найболш ясна праяўляецца спецыфіка літаратурнай мовы. Характар і склад наддыялектных форм існавання мовы мяняюцца, адлюстроўваючы якасныя пераўтварэнні грамадскіх адносін. У сучасны момант усацыялінгвістыцы вылучаюцца наступныя наддыялектныя формы існавання мовы: народна-гутарковая мова, кайнэ, прастамоўе, мова-піджын і крэольская мова.

Народна-гутарковая мова стаіць бліжэй за ўсё да літаратурнай, бо першая, як і апошняя, з'яўляюцца **агульнанароднымі**, г.зн. ужывальнымі на ўсёй тэрыторыі рассялення дадзенага этнасу. З астатнімі вуснымі наддыялектнымі формамі народна-гутарковую мову аб'ядноўваюць вусны характар бытавання, ненарматыўнасць, неапрацаванасць сістэмы. Элементы народна-гутарковай мовы — гэта элементы, якімі наогул вусная мова адрозніваецца ад пісьмовай, а сярод іх тыя, што ў пэўных адносінах (словаўтваральных, лексічных) адрозніваюцца ад найбольш ужывальных, а значыць, нарматыўных сродкаў літаратурна-пісьмовай мовы. Гэта лексічныя, словаўтваральныя, граматычныя сродкі, якія знаходзяцца **на перыферыі** літаратурнай мовы.

Відаць, найбольш падыходзячым прыкладам народна-гутарковай мовы з'яўляецца рэгіянальна неабмежаваная, выкарыстоўваемая як сродак вусных зносін чэшская ўжыткова-гутарковая мова (obecná čeština), якая мае свае асаблівасці, адрозныя ад літаратурнай мовы, на ўсіх узроўнях моўнай структуры (у фанетыцы, граматыцы, лексіцы). За чэшскім ужыткова-гутарковым маўленнем замацавана значна больш ёмкая сфера зносін, і яна ўжываецца не толькі людзьмі, якія не валодаюць літаратурнай мовай, але і на сходах, якія не маюць афіцыйнага характару, нават у спецыяльных дыскусіях, у звычайнай гутарцы (у маўленні, напрыклад, выкладчыкаў Карлавага універсітэта). Найбольш верагодна, што беларуская народна-гутарковая мова ўжывалася таксама ў гарадах, дзе ў сферы паўсядзённага жыцця сутыкаліся прадстаўнікі розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама розных этнасаў (нагадаем, што насельніцтва гарадоў папаўнялася за кошт беглых сялян, а таксама перасяленых феадаламі рамеснікаў з ліку прыгонных, а яны наўрад ці былі ўсе з арэала пашырэння аднаго якога-небудзь дыялекта (прадстаўнікоў іншых этнасаў). У больш буйных гарадах у ліку жыхароў былі выхадцы з малых гарадоў і мястэчак, якія належалі прыватным уладальнікам. У інвентары Бабруйска 1639 г. называюцца выхадцы з Капыля, Свіслачы, аддаленых тэрыторый — Жамойці, Валыні, Масковіі, Венгрыі. Археолаг Ф.Гурэвіч зазначала, што прыёмы домабудаўніцтва, прадметы матэрыяльнай культуры, знойдзеныя падчас раскопак старажытнага Ваўкавыска, указваюць на тое, што ён быў заснаваны выхадцамі з Валыні. Акрамя таго, матэрыяльная культура гэтага горада сведчыць аб прысутнасці тут заходніх славян-мазаўшан, а таксама балтаў. Мазавецкі і балцкі элементы выяўлены і ў матэрыяльнай культуры Наваградка. Тое ж самае можна сказаць і ў адносінах да іншых гарадоў Панямоння. Натуральна, ва ўмовах такой этнічнай стракатасці зносіны не маглі адбывацца на якім-небудзь канкрэтным дыялекце. З другога боку, не магло быць зносін і на літаратурнай мове, бо патэнцыяльныя субяседнікі па розных прычынах валодалі ёю ў вельмі розным ступені або і зусім не валодалі. Значыць, зносіны ва ўмовах этнічнай стракатасці гарадоў маглі адбывацца на народна-гутарковай форме мовы карэннага славянскага этнасу — беларусаў. Можна даказаць існаванне народна-гутарковай мовы ў старажытнай Беларусі і падыходзячы з другога боку: паколькі існавала сфера ўжывання такога моўнага ўтварэння — штодзённае жыццё, быт, моўны ўжытак, то існавала і само ўтварэнне, якое абслугоўвала гэтую сферу.

(Працяг будзе.)

Мікалай КРЫЎКО

СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ

ПЕРФАРАВА́ЦЬ медыцынскае (парушаць цэласнасць сценкі якога-н. органа), **ПРАБАДА́ЦЬ** мед.

— Перфара́цыя, прабадзе́нне.

ПЕРШАКЛА́СНЫ (выдатнай якасці, вартасці) *Спецыяліст, ведама, Шпілеўскі першакласны — залатыя рукі* (Савіцкі). *Гэта быў і не першакласны рэстаран, але Саколіч, які прыйшоў сюды з сябрамі адзначыць заканчэнне вучылішча, мог дазволіць сабе такую раскошу першы раз у жыцці* (Вітка). *Дзяржаўны Эрмітаж у Ленінградзе мае выдатную калекцыю першакласных твораў Рэмбранта* («Беларусь»), **ПЕРШАРАЗРА́ДНЫ** размоўнае *Прайшло некалькі год з таго дня, калі Л. упершыню села за камутатар. За гэты час яна вырасла ў першаразрадную тэлефаністку* («Звязда»). *Першаразрадны хлус,* **ПЕРШАГАТУНКО́ВЫ** разм. *[Культработнік:] — Працую я ў клубе на ўвесь горад вядомай прамарцелі, якая робіць першагатунковы рамонт абутку* (Кавалёў). **ПЕРШАСО́РТНЫ** разм. *Першасортны спецыяліст,* **ПЕ́РШЫ** *Вясёлая, жывая, дурасліва́я, свавольніца і першая штукарка на розныя забаўкі і выдумкі, — вось якая была Кублікавых Аўгіня* (Колас). *На ўвесь Сівец яна [Таццяна] была першы абаронца і спацяшальнік жанчын, што абшаснуліся на слізкай дарозе* (Зарэцкі). *Хоць і прыйшоў Пеця ў школу з вялікім спазненнем, гэта ўсё ж не пашкодзіла яму хутка выбіцца ў першыя вучні* (Ракітны), **ВЫСО́КАГА** (або **ВЫШЭ́ЙШАГА, НАЙВЫШЭ́ЙШАГА, ПЕ́РШАГА**) **КЛА́СА** *Гэта [выявіць у кароткім дыялогу сутнасць характару персанажа] пад сілу толькі майстрам высокага класа* (Гілевіч). *Ён [лётчык] з'яўляецца спецыялістам высокага класа, умела водзіць самалёт у складаных умовах* («Маладосць»). *Працаваў Міхайла тынкоўшчыкам. Гэта быў, як кажуць, майстар вышэйшага класа* (Даніленка). *Буйскі... выдатна валодае нямецкай мовай і... іменна гэта акалічнасць... робіць з яго разведчыка вышэйшага класа* (Шамякін). *Многія гадзіннікі першага класа вызначаюцца тым, што не баяцца ўдару, пылу, вільгаці, вады* («Звязда»). *Я ішоў то ўперадзе, то заходзіў назад, падчышчаў, як кажуць, паказваў і раіў тым, якія адставалі, хоць і з мяне, адчуваў я, касец быў не першага класа* (Я.Ермаловіч), **ПЕ́РШЫ КЛАС** разм. *Музыка была — першы клас...* (М.Стральцоў). *Яна, па праўдзе сказаць, і нічога была: і з твару — цяпер яшчэ помніцца, — і фігура першы клас* (Гігевіч), **КЛАС** разм. *Стрэльба — клас! Б'е напавал* (Калачынскі). *— Цялушкі — клас! — Паўлік не стрымаўся, лёгка перасігнуў жардзяную агароджу* (Дуброўскі), **КЛА́СНЫ** *разм. [Брыгадзір:] — Не тушуйцеся — навучым. Класная бетоншчыца выйдзе, а там і журналістка будзе свая* (Грахоўскі), *[Андрэй Пітолін:] — Не, твой здольны хлопец. З яго выйдзе класны танкіст, пабачыш! Ручаюся* (Грамовіч), **ВЫШЭ́ЙШАЙ** (або **НАЙВЫШЭ́ЙШАЙ, ПЕ́РШАЙ**) **МА́РКІ** разм. *Махляр вышэйшай (найвышэйшай) маркі. Ну, браце, гэта ж сам пан Маслянка!.. Між іншым, гэта — скаціна і садыст вышэйшай маркі. Усім паветам трасе, як чорт сухой грушай* (Машара). *Кавалак куцці ты! Саладуха! Трус п'яны першай маркі!* (Мурашка), **ВЫСО́КАЙ** (або **ВЫШЭ́ЙШАЙ, ПЕ́РШАЙ**) **ПРО́БЫ** *Паэзіяй найбольш высокай пробы ў яго [Міколы Аўрамчыка] становяцца не простыя ўражанні быцця, якія прайшлі праз ягоную душу, у той ці іншай сувязі ўсхваляваўшы яе, а ў простым, непасрэдным сэнсе сталі часткай яго рэальнай біяграфіі* (Бугаёў). *Звяртаючыся да Веры, Эма сказала: — Верачка, мы не памыліліся. Гэта была правакацыя высокай пробы* (Машара). *Тут, на Мазырскім нафтабудзе Еўдакавец атрымаў загартоўку вышэйшай пробы* («Звязда»). *А маліна самай першай пробы. Больш нідзе такой не знайшоў* (Свірка), **ПЕ́РШАГА ГАТУ́НКУ** і **ПЕ́РШЫ ГАТУ́НАК** разм. *Ён стралок першага гатунку. Ён — майстар* (Бядуля). *Гэтыя брыгады... выпускаюць прадукцыю першага гатунку* («Беларусь»). *Юшка, брат, будзе першы гатунак. Нават Трыфанавіч будзе задаволены* (Караткевіч). *[Грыбоўскі:] — Куры, Васіль, фабрычны, першы гатунак* (Курто), **ПЕРШАГА СО́РТУ** і **ПЕ́РШЫ СОРТ** разм. *У Мінску дактары добрыя. Першага сорту спецыялісты* (Мележ). *[Дзяк:] — Закурвайце... Табак першага сорту. Два гады ляжаў, усё мацунку набіраўся* (Чорны). *— Брыгадзір з цябе першы сорт! — заўважыў Пракоп* (Колас). *Салавей наліў у кубкі каву і пахваліў: — Першы сорт, афіцэрская!* (Гурскі), **ПЕ́РШАЙ РУКІ́** разм. (пра чалавека: найвышэйшай якасці, з вышэйшай ступенню якога-н. майстэрства) *[Дудок:] — Сумна мне без работы... Я, можна сказаць, першай рукі сапёр! Я, дзеду, што хочаш змайструю!* (Лынькоў). *[Старшыня калгаса:] — А вы думаеце, ён [Сымон] сам абы-хто? Першакласны музыка і цясляр першай рукі* (Чарнышэвіч), **ПЕ́РШАЙ ГІ́ЛЬДЫІ** разм. (пра чалавека: найвышэйшай якасці, з крайнім праяўленнем якіх-н. якасцей) *— А чыя ж то скрыпка гэта? — зноў спытаўся гаспадар. — А яго! О, граць ён мэта: першай гільдыі штукар!* (Колас). *А тое, што я цябе, абібока, трымаю на ўчастку, дык гэта правільна? Ты ж дармаед першай гільдыі* (Супрунчук), **АДМЫСЛО́ВА** *Рыбак быў дзядзька наш Антоні, Як і работнік, адмысловы* (Колас). *Перад ім [Клеберам] паставілі задачу: стаць адмысловым вайскоўцам* (Чорны).

У пошуках ісціны

Што абараняе рэцэнзентка?

З наданнем нашай краіне статуса незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь — стала адраджацца наша культура і мова. Але працэс гэты ідзе марудна, бо не ўсе яму спрыяюць. І гэта не выпадкова: надта ж глыбокія карані пусціла шматгадовая былая дзяржаўная палітыка, якая, паводле трапных справядлівых словаў народнага паэта Беларусі, прафесара, старшыні Камісіі па культуры, адукацыі і захаванні гістарычнай спадчыны Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Ніла Гілевіча, «была накіравана на русіфікацыю ўсіх этнасаў на тэрыторыі СССР і на ўтварэнне адзінай «новай гістарычнай супольнасці — савецкага народа» — з адзінай, канешне, рускай мовай, а значыць — на ўтварэнне ў рэшце рэшт адзінага рускага народа. Шляхі і спосабы асіміляцыі былі самыя розныя... Поўнае засілле рускай мовы ў інфармацыйнай прасторы...» («Народная воля». 1995, № 1).

Дзеля адраджэння нашай мовы — галоўнага інструмента нацыянальна-культурнага адраджэння — сёння ўжо робіцца нямала. Праведзены І і ІІ Нацыянальныя канферэнцыі «Беларуская навуковая тэрміналогія». Выйшлі з друку новыя тэрміналагічныя слоўнікі. Надрукаваны шэраг артыкулаў, прысвечаных дэрусіфікацыі нашай культуры і мовы. Ідзе «прыярытэтная арыентацыя на сродкі роднае мовы, імкненне надаць тэрмінам нацыянальна-моўнае аблічча з выкарыстаннем адметнай лексікі, тыпова беларускіх словаўтваральных суфіксаў і мадэляў,» — справядліва канстатуецца ў «Тэрміналагічным слоўніку па вышэйшай матэматыцы для ВНУ» (Мн., 1993). І ў «Русско-белорусском математическом словаре» (Мн., 1993) бачым гэты працэс дэрусіфікацыі — «исключение русизмов и слов, образованных по чуждым белорусскому языку моделям (прэдзел, прадстаўленне, убываць, слов з суффиксами **-ір, -ем, -уч, -юч**»).

На пачатку 1994 года Беластоцкай філіяй Варшаўскага універсітэта быў выдадзены трохмоўны Słownik terminologii lingwistycznej (białorusko-rosyjsko-polski i polsko-rosyjsko-białoruski). У даведніку ўлічаны новыя тэндэнцыі ў беларускай навуковай тэрміналогіі, пададзены шэраг натуральных беларускіх тэрмінаў.

Але вось у штотыднёвіку «Наша слова» (№ 32, 95) з'явілася на яго рэцэнзія Ганны Арашонкавай пад назвай «Параўнаем». Аўтарка настойліва імкнецца абараніць ранейшы — зрусіфікаваны стан беларускай лінгвістычнай тэрміналогіі (гл. пра гэта артыкул «Наша мова — мова навукі. Праблемы нармавання лінгвістычнай тэрміналогіі» — «Роднае слова», 1995, № 4). Яна піша: «У апошні час намецілася тэндэнцыя замены тэрмінаў з суфіксам **-уч (-юч), -ач (-яч)** іншымі суфіксальнымі ўтварэннямі. Напрыклад, замест *дзеючая асоба — дзейная асоба*, замест *утвараючая аснова — утваральная аснова,* замест *кіруючае слова - кіравальнае (кіроўнае) слова,* замест *падаючая плынь — спадальная плынь* і інш.

Аднак такая замена не заўсёды апраўдана як з боку сістэмнасці ў мове, так і з боку семантыкі». Далей у рэцэнзіі ідзе абарона гэтых «лямантуючых» утварэнняў з суфіксам **-ач, -уч**. Напрыклад, у тэрміналагічных словазлучэннях *дрыжачы зычны, дрыжачы гук* слова *дрыжачы* ў Слоўніку заменена на *дрыготкі...* парушана слова-ўтваральная сувязь з іншымі тэрмінамі.

Рэцэнзентка за аднаўленне тэрміна «дрыжачы» гук, як і «гаворачая асоба». «Слова гаворачая суадносіцца з дзеясловам гаварыць. Параўн. рас. *говорящее лицо (говорящий)* польск. *mowiący* ад *mówić «гаварыць».* З яе гледзішча, слова *моўнік* таксама штучнае. Але ж *моўнік* якраз і стасуецца з дзеясловам *мовіць,* якое Тлумачальны слоўнік падае з тым самым значэннем, што і *гаварыць.* Да таго ж, апошнім часам замест гэтай штучнай для беларускай мовы калькі «гаворачая асоба» (рас. *говорящее лицо)* выкарыстоўваецца і *размоўца* (той, хто размаўляе).

Не задавальняе Г.Арашонкаву і паралельнае выкарыстанне ў Слоўніку тэрмінаў *запазычаны* і *пазычаны, запазычанне* і *пазычанне.* Яна супраць сваіх адметна беларускіх беспрыстаўкавых словаў, якія маюць народную аснову, *пазычаць, пазычанне, пазычаны,* «таму ў рэцэнзуемым слоўніку трэба было даць толькі «запазычаны — запазычанне, запазычванне». Далей яна тлумачыць: «Варыянты без прыстаўкі **за-** адрозніваюцца ад варыянтаў з прыстаўкай **за-** па значэнні або не ўжываюцца наогул. Напрыклад, пазычаны — такі, які ўзяты (або дадзены) на час, які трэба аддаць, вярнуць..., пазычаць — даваць каму-н., што-н. у доўг або браць у доўг, на пэўны час...». Але ж гэтыя высновы рэцэнзенткі не адпавядаюць рэчаіснасці. «Русско-белорусский словарь» 1993 года (т.2, с. 497) сведчыць, што згаданыя беспрыстаўкавыя і прыстаўкавыя словы выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, як паралельныя тэрміны са значэннем расійскага «перенять». На с. 497 2-га тома чытаем: «Перенятый... 2. пазычаны, запазычаны: перенять... 2. (заимствовать) пазычыць, запазычыць; перенимать... 2. (заимствовать) перен... пазычаць, запазычаць, запазычваць»

Як бачым, са значэннем рас. «заимствовать», «заимствованный» Слоўнік нават на першае месца выносіць беспрыстаўкавыя варыянты. Гэта засведчана і «Русско-белорусским словарём» 1982 года пад рэдакцыяй акадэміка К.Крапівы, дзе ў другім томе на с.40 бачым абсалютна тое самае. І таксама на першым месцы стаяць беспрыстаўкавыя варыянты. Дык ці не ўводзіць Г.Арашонкава ў зман чытачоў у дачыненні тэрмінаў пазычаныя словы, «пазычаць словы». Яшчэ акадэмік Яззп Лёсік, дырэктар Інстытута навуковай мовы, у дваццатыя гады пісаў: «Бяда не ў тым, што літаратурная мова часам *пазычае словы, пазычаць* трэба, калі іх няма, зусім неразумна браць чужыя словы, калі ёсць свае, беларускія». Калі кіравацца высновамі рэцэнзенткі, то Яззп Лёсік памыляўся, пішучы гэтыя радкі. Або вось наш слынны прапагандыст беларускага слова пісьменнік Уладзімір Юрэвіч у кнізе «Слова жывое, роднае, гаваркое» (Мн., 1992), уганараванай Дзяржаўнай прэміяй, піша: «Слова ўтворана ад дзеяслова «вітацца». *Слова пазычанае,* корань яго трэба шукаць у лацінскай мове, дзе ёсць *vita,* што значыць «жыццё». Або на с. 82: «Ада, Адалаіда, Адэлія. Усе гэтыя *імёны пазычаныя».* І далей (с. 107): «Усе кананічныя *імёны* былі *пазычаны».* Калі верыць Г.Арашонкавай, то ўсе гэтыя кананічныя імёны ўзяты на час і іх «трэба аддаваць назад». Але ж іх ніхто не вяртае. Як і ўсе пазычаныя словы. Вось якая рэчаіснасць.

Адвольна, на свой густ, дзеля «доказнасці» сваіх высноваў, абыходзіцца рэцэнзентка і са значэннем іншых — адметных ад расійскіх — словаў. Так, яна супраць таго, што ў Слоўніку падаюцца словы *шэраг* і *гурт* як сінонімы да *рад,* бо з яе гледзішча, яны таксама адрозныя. Але звернемся зноў да лексікаграфічных прац.

Слова *шэраг* яшчэ ў адраджэнскія 20-я гады выкарыстоўвалася са значэннем рас. «ряд». Гэта зафіксавана і ў «Беларуска-расійскім слоўніку» М.Байкова і С.Некрашэвіча (Мн., 1926). На с. 354 чытаем: *«Шэраг* м. — *шеренга; ряд».* «Беларуска-рускі слоўнік» 1988-89 пад рэдакцыяй акадэміка К.Крапівы падае слова шэраг з тым значэннем, што і рас. *ряд.* У другім томе на с. 725 чытаем: *«Шэраг*, -гу м. в разн. знач. *ряд; шэраг дамоў — ряд домов; шэраг пытанняў — ряд вопросов».* Тут падаецца і ўстойлівае спалучэнне: «у першых шэрагах — в первых рядах». «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. 5, кніга 2. Мн., 1984, с. 437) так тлумачыць значэнне гэтага слова: *«Шэраг,* -а, м. 1. Сукупнасць аднародных прадметаў, размешчаных адно за адным, у адну лінію. 2. Сукупнасць чаго-н., што ідзе адно за другім у пэўным парадку».

Слова *гурт* у «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 2, Мн., 1978, с. 98) падаецца і са значэннем «Група якіх-небудзь аднародных прадметаў». Ад слова *гурт* утвораны дзеяслоў *гуртаваць* — «групаваць, канцэнтраваць»: А ваш абавязак... збіраць народ, гуртаваць яго ў баявыя групы. Колас. (Тамсама).

Як відаць, словы *рад, шэраг, гурт* выступаюць у беларускай мове і з сінанімічнымі значэннямі. Рэцэнзентка ж спрабуе адкінуць адмысловыя параўнальна з расійскаю моваю тэрміны *шэраг* і *гурт,* паказваючы ў рэцэнзіі толькі іх асобныя значэнні і апускаючы супольныя. «Таму, — піша Г.Арашонкава, — у тэрміналагічных спалучэннях са словамі «сінанімічны», «фанемны» мэтазгодна захаваць слова «рад», бо яно ўжываецца «на працягу доўгага часу». Далей раіць «даць незамкнуты рад слоў замест незамкнуты шэраг слоў». Рэцэнзентка і за тэрмін «племянная мова» (Як і *племянная* карова!), супраць новага слова — утварэння з высокавалентавым (спалучальным) суфіксам **-ев**: племевы дыялект (г.зн. уласцівы племю). Г.Арашонкава патрабуе, «каб аўтарскі калектыў у будучай працы па перавыданні пазбягаў замены ўвайшоўшых у лінгвістычную практыку тэрмінаў на новыя». У гэтым — уся ідэя рэцэнзіі: захаваць усё як было, бо «яно замацавалася ў практыцы». Хоць добра ўсім ведама, што гэта была за практыка.

Калі б рэцэнзентка пазнаёмілася з новымі публікацыямі па тэрміналогіі, у іх ліку і лінгвістычнай, то, магчыма, яна прыхільна паставілася б і да новых тэрмінаў у рэцэнзаваным Слоўніку.

Павел СЦЯЦКО,
прафесар, старшыня Гродзенскай абласной Рады ТБМ імя Францішка Скарыны.

Творчасць нашых чытачоў

Вера БУЛАНДА

Надзея памірае апошняй...

Смяецца той, смяецца хто апошні...
О, дай жа, Бог, ратункам у жыцці
Мне пасмяяцца з тых, хто дзеля грошай
На здраду ці панель гатоў пайсці.

Хто ўмее жыць па-свойму, нажывацца,
Сумленнем ахвяруючы. І ў пыл
Ператвараючы маральныя багацці,
Перарабляць жыццё на свой капыл.

Хто асудзіў на выжыванне рэкі,
Забрудзіўшы нядбайнасцю тупой,
Дзе птушкам не пад сілу нават рэквіем
І зверу не да смаку — вадапой.

Хто мову адмаўляе як крыніцу
Жыцця майго і дарагіх уцех.
А як і чым нам будзе прычасціцца,
Калі прычасце пушчана на здзек?

Не навіна́ — насмешка злога року
Праследуе адданых дабрыні:
Не зробім без падножкі ані кроку,
І не жывем з падтрымкаю ані.

Настырна тку, нанізваю на кросны
Ад продкаў мудрасць кінутую нам:
Смяецца той, смяецца хто апошні
Гаючая надзея, як бальзам.

***

Ну, што ж, — не такая, як вы,
Няхай жа мы ўсе будзем розныя.
Толькі ж да роднай травы,
Толькі ў раніцы росныя
Не забывайцеся вы
Прыходзіць са мною босымі.

Паважаная рэдакцыя!

Нярэдка даводзіцца чытаць у газетах развагі аналітыкаў, творчых людзей, дзе яны шукаюць адказу, чаму так люд беларускі паставіўся негатыўна да роднай мовы, галасуючы на рэферэндуме. Іх зразумець можна. Аднак, мне здаецца, — час сказаць адкрыта і пра тое, што і творчая інтэлігенцыя, бадай, у сваёй большасці была вінаватая ў гэтым. І частка яе і цяпер свядома ці несвядома працягвае заставацца ў слёзнай настальгіі па былым, хаця піша на роднай мове, супраць якой быў арганізаваны апыт. Аб гэтым мой верш, які прапаную.

Аўтар.

Мікола ДУБОЎСКІ

Настальгія

Часам верш прачытаю ў газеце
І няўцямлю ягоны сюжэт —
Перапёлкай самотнай па леце,
Па Былым там галося паэт.
Што пазбаўлены сёння прысмакаў,
А былі ж... кілбаса ды ікра.
Ганарары — што коцік наплакаў,
Болей кніжкі не йдуць на-гара.
А здаралася часам і Першы
Неспадзёў да сябе запрашаў,
За адданыя Партыі вершы
Па-сяброўску руку паціскаў.
А цяпер хоць жывы, а забыты.
І не дзе, а ў родным двары.
Апынуўся ля ночваў разбітых,
Як у казцы вядомай, стары.

* * *

Вось такая ў яго настальгія.
І не скажаш нічога ты тут —
Калі просіцца рабская шыя
У былы і жаданы хамут.
Што ГУЛАГ для яго, Курапаты!
Выракаецца мовы бацькоў.
Не шкада нават роднае хаты.
Толькі дайце Саюз яму зноў.

Уражанні

Мікола КАПЫЛОВІЧ

Як зладзеяў пладзілі

— Падваліны падгнілі ў хаце. Скрывіла сцены, скасабочыла. Ну, не хата, а інвалід. Толькі замест кастылёў падпоры ёй падавай. Напісаў я ў сельсавет заяву, каб лесам памаглі. І занёс. Месяц чакаю, два. Трэці пайшоў. Ціха. А хата тым часам зусім пачала рассыпацца. Нават дах паехаў. Не вытрымаў і зноў пайшоў у сельсавет. Не можа таго быць, думаю, каб мне, франтавіку і былому калгаснаму трактарысту, лесу не выпісалі. Зайшоў. А там ужо новы старшыня сядзіць. Малады, шустры такі. Пачаў шукаць у стосе маю заяву. Усе паперы перакапаў: у стол залез з галавою, але не знайшоў. Згубілася недзе. Потым кажа: «Я тут новы чалавек. І вашай заявы не бачу. Пішы новую». «Ды вас, — адказваю, — па чатыры разы на год мяняюць. Дайце лесу, бо хата вось-вось перакуліцца». «Без заявы не дамо», — гаворыць новы старшыня. Зноў напісаў. Зноў чакаю. Прагналі і гэтага шустрага за п'янкі. Зноў новага прыслалі. Але да гэтага я не пайшоў прасіць лесу. Выгнаў гарэлку, падпаіў трактарыста, і ён цэлы прычэп бярвенняў з лесу мне прывалок. Украў. Вось так савецкая ўлада сваіх зладзеяў пладзіла.

Данос на сябе

— Які, пытаеш, адразу пасля вайны ў нас быў старшыня сельсавета? Сляпы на адно вока. Пісаць і чытаць не ўмеў. Затое моцна крычаў на людзей, каб нядоімкі плацілі. І за падаткі людзей садзіў у турму. Потым і яго пасадзілі. За што, пытаеш? Адзін наш калгаснік, Міканор, напісаў заяву ў міліцыю. Ад імя гэтага старшыні. А ў тым даносе было такое: «Я, Сцяпан Крукоўскі, у час вайны быў нямецкім агентам у партызанах, а цяпер прабраўся рабіць старшынёй сельсавета і даю сакрэтныя звесткі амерыканскай разведцы, зрываю падаткі ў фонд дзяржавы. І, каб прыкрыць свае злачынствы перад савецкай уладай, афармляю ў суд калгаснікаў, каб разваліць калгас».

Напісаў Міканор такую заяву і панёс Крукоўскаму, каб той пячатку на ёй паставіў. П'яны старшыня і заверыў. І Міканор паслаў тую заяву ў міліцыю. Праз тыдзень не стала Крукоўскага. Пасадзілі.

Ваўкалака

— Бач, вунь Антон пайшоў. Некалі старшынёй калгаса ў нас быў. І не прасыхаў ад гарэлкі. Нап'ецца — і давай кулакамі махаць. Каму па шчэлепах, каму пад дых. Так на работу ў калгас людзей гнаў, каб на нішчымныя працадні рабілі. І нікому не даваў сена выкасіць. Жаць нават асаку не дазваляў. Паганы быў чалавек. Жыла я тады ў сваёй хацінцы. З маленькімі дзеткамі: адно другога не панясе. Мой чалавек на вайне галаву паклаў. І вось аднаго разу нажала сярпом у карчах асакі. Дала ёй высахнуць, потым згарнула ў посцілку, закінула за плечы і панесла тое сянцо дамоў. І раптам чую: з-за маёй спіны дымам цягне. Азірнулася — сена ў посцілцы гарыць. Скінула ношку з плеч і давай тое сена тушыць нагамі, лыткі апякла. Хацела посцілку выратаваць з агню. Згарэла ўсё ж яна. А Антон у гэты час стаіць воддаль і аж на зямлю кладзецца ад рогату. Так смешна яму было, што за маёю спіною сена падпаліў. Вось якім ірадам быў Антон. Калі старшынёю быў. Ён і цяпер такі. Бач, на людзей воўкам глядзіць. Ну, чыста ваўкалака.

Абцыганіла

— Сяджу я дома, абед рыхтую. І раптам — званок у дзверы. Адчыняю. Цыганка на парозе стаіць. Разам з цыганём. Кажа мне: «У мяне, паненачка, ёсць пяць упаковак французскай парфумы. Купляйце, даражэнькая. Дэфіцыт! Нідзе такой не дастанеце. Па сходнай цане прадам. Я дома ўпакоўкі пакінула. Дай наперад грошы. Тады я пабягу па дэфіцыт. А пад заклад я табе свайго сыночка пакіну». Паверыла, аддала ўсе грошы, якія былі ў кватэры. Пабегла цыганка дамоў па дэфіцыт. А я зноў пайшла на кухню абед варыць. Вару і чакаю. А цыганкі ўсё няма і няма. Зірнула ў гасцінную, дзе цыганка сваё дзіцятка пакінула. А цыганяці там няма. Праз акно ўцёк. Прыйшоў мой Сяргей з работы абедаць. Я яму і расказала, што здарылася. Дык ён мне той абед ледзь не вывярнуў з посуду на галаву. Вось як мяне цыганка абцыганіла.

Для ўдзелу ў музычным фестывалі «Залатыя ключы» ў Салігорск з'ехаліся маладыя выканаўцы з беларускіх гарадоў і з замежжа. Гэты конкурс праводзіўся ў рэспубліцы ўпершыню. Назва выглядае як сімвал, нібы ключы да маладых талентаў.

На здымку: Пераможца конкурсу «Залатыя ключы» **Марыя Рымша.** Беларуска па паходжанні, яна прыехала на фестываль з далёкага Арэнбурга.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ. Белінфарм.

Дзе шукаць праўду?

Шаноўны Слухач!

Польскае Радыё запрашае Цябе далучыцца да кола нашай аўдыторыі. Шмат хто на Беларусі ўжо слухае беларускамоўныя дваццаціпяціхвілінныя праграмы з Варшавы, якія гучаць тройчы ў дзень.

У гэтых перадачах ты зможаш даведацца пра тое, чым жыве сённяшняя Польшча, які стан яе эканомікі, што цікавага адбылося ў палітычным, культурным ды грамадскім жыцці гэтае краіны. Што ж датычыць падзеяў у Менску, то мы іх асвятляем па-свойму. Варта знайсці нас у эфіры і параўнаць нашыя навіны з навінамі, якія гучаць на хвалях іншых радыёстанцыяў!

Змест нашых перадачаў залежыць між іншым ад Вас. Пішыце пра тое, што Вам падабаецца, і пра тое, што ў нашых перадачах трэба, на Вашую думку, змяніць, пішыце, як нас чуваць. Раскажыце пра нашыя перадачы сваім знаёмым ды сваякам. Няхай яны й самі напішуць пра свае ўражанні. А каб паменшыць кошты перасылкі, некалькі лістоў можна выслаць у адным канверце. На дасланыя Вамі адрасы Вашых сяброў ды знаёмых будзем высылаць інфармацыйныя лістоўкі з раскладам беларускамоўных перадачаў Польскага Радыё. Мы хочам паведаміць пра сябе як мага большаму колу слухачоў. Калі ёсць магчымасць, павесце нашую інфармацыйную ўлётку ў сядзібе якой-колечы палітычнай альбо грамадскай арганізацыі. Адрасы розных арганізацыяў (з розных гарадоў Беларусі) таксама нам патрэбныя.

Як бачыш, просьбаў у нас шмат. Але, калі ты нам дапаможаш, мы паспрабуем не застацца ў даўгу. Тыя, хто нас слухае, лістуе з намі, дасылаючы нам весткі пра тое, як нас чуваць, ведаюць, што гэта не пустыя словы. Чакаем Тваіх лістоў!

А цяпер, калі ў Менску 14.30, 16.30 альбо 19.00, уключы прыймач, знайдзі адпаведную хвалю і... СЛУХАЙ!!!

У эфіры!

Беларуская рэдакцыя Польскага Радыё
5 праграма для замежжа
00—977 Варшава
P.O.Box 46.

І смех і грэх

Прэса-куламеса

Жахі ў тундры

«Едуць геолагі па тундры, спыняюць мясцовага **жахара**:

— Дзе тут у вас гарэлку можна купіць?»

«Звязда».

Як жа паміраюць у Аўстрыі?

«І яны асуджаны без дарагога лячэння **па аўстрыйскай тэхналогіі»**.

«Звязда».

Навіны перакладу

«Творчасць яго была багатай: паэмы і вершы, літаратурна-крытычныя артыкулы, пераклады на беларускую мову твораў А.Пушкіна, Т.Шаўчэнкі, С.Ясеніна, А.Твардоўскага, А.Пракоф'ева, А.Малышкі, М.Нагнібеды, М.Рыльскага, М.Лермантава, **«Анеіды»** І.Катлярэўскага, **«Спевы аб Гаяваце»** Г.Лангфела».

«Пралеска».

Афарызмы

Мілан БАШЫЧ

Незацяганыя выразы

Ён шукаў аднадумцаў, а калі не змог адшукаць, перайшоў да ўзгаднення пазіцый.

Хоць і быў на мяжы розуму, апынуўся ў цэнтры ўвагі.

Толькі калі нянавісць пасеялі, пачаліся варагаванні між людзьмі.

Мэта дасягнута, а інвестыцыі прапушчаны.

Калі не вядома, хто п'е, а хто плаціць, усё роўна вядома, хто зарабляе.

Жэрабя кінута, адказнасць адкінута.

Ён абаіраецца на свае сілы і на грамадскія сродкі.

Многія адкрытыя пытанні вырашаюцца за зачыненымі дзвярыма.

Меў слабы характар, але магутнага бацьку.

Калі злодзей злодзея застае на справе, яны перш за ўсё абменьваюцца вопытам.

Настаўнікі бастуюць, вучні адмоўна ацэньваюць іхнія паводзіны.

Крызіс усё глыбейшы, а кішэні ўсё плытчэйшыя.

З сербскай мовы пераклаў Іван ЧАРОТА.

Пародыі

Георгій ЮРЧАНКА

Хомкава перамога

(Хрысціна Лялько)

Хомка ва ўсім быў чалавек адметны: маленькі, мітуслівы, з адтапыранай, бы палукашак, ніжняй губой. Меў ён рабенькі твар з пляскатым носам, глядзеў заўсёды з прыжмур.ам. Хадзіў смешна, па-качынаму перавальваючыся з боку на бок. Рыжая чупрына не хацела падпарадкоўвацца грабянцу, клокам звісала на нізкі лоб і глыбока пасаджаныя вочы пад белаватымі, як злінялымі, брывамі.

Яго кабета да работы была ўчэпістая, заядлая. Выпетрала ўся, а свінарнік не кідала, выструньвалася на ім да шалёнага біцця сэрца. Усюды спяшала подбежкам. Яе літыя гумовікі, здаецца, не паспявалі за збеганымі нагамі. У любы момант магла зачаць калатнечу, нават сярэдначы. Заўсёды трашчала без перасціху. Анікомачку не пажадаць такой бабы; у яе жаба на языку спячэцца.

Пад старасць заманулася ёй займець адрыну. Разляпала ў свінарніку:

— Буду цэлае лета ў адрыне спаць, яшчэ восені прыхаплю.

Бабы пасмейваліся: патрэбна ёй адрына, як дзірка ў мосце.

А яшчэ любіла Хомчыха хваліцца: і спадніцаю, і ступаю, і пеўнем, і мышамі. Зайздрасць раз'ядала бабу: як гэта так — у Аўдулі новы таўкач, а ў яе стары.

Хомку свайго ў грош не ставіла: і качар клышаногі, і грыб разлезлы, і падэшва ад стаптанага галёша, і пудзіла гарохавае. Калі пасля абеда Хомка клаўся перадыхнуць, яна, каб неяк дапячы, пачынала чапялой біць мух. Натыркаўшыся ў сцены, голасна кляла насякомых, Хомку і сваю няшчасную жытку. А пасля прымушала мужыка выціраць сцены мокрай анучкай. Яму было хоць жывому ў зямлю лезь.

Калі Хомчысе прыйшла думка пра адрыну, яна з нецярпячкай год пілавала мужыка. Ён разумеў, што баба з карка не злезе. Але ў яго душы расла нязгода, і нарэшце ў голаў цюкнула азарэнне. Неяк па вясне сказаў:

— Я табе за тыдзень адштукую адрыну.

Раніцой у нядзелю абвясціў:

— Бяры водпуск. Заўтра паедзеш да зяця і прышлеш яго сюды. А сама тыдзень пажывеш у дачкі, паняньчыш малых.

Хомчыха расквітнела.

На золку згатавала сняданак і выбралася ў дарогу. А пад вечар прыджгаў зяць. Назаўтра зранку зачалі працу. Капаў Хомка стараніва. Не звяртаў увагі на камароў, што бязлітасна цялі ў спіну.

Уся вёска ўзрушана трашчала, што Хомка будуе адрыну. Але навошта на адрыну глыбачэзная яма? Мужчыны ажно шапкі з патыліц ссоўвалі. А бабы толькі хусты папраўлялі.

Да суботы на Хомкавым падворку была гатова сажалка. Гаспадар пераживаў ні з чым не параўнанае ўзрушэнне. Уяўляў: будзе пахнуць рыбаю, рачным глеем, водарасцямі; цудоўнай музыкай разліецца вячэрняе кумканне жаб. Затым ён згледзіць мігатліва-недасяжныя зоркі і загадкава-ціхі месяц. Адчуе яднанне душы з прыродай. Ад мар саладкава і тонка патыхала нечым даўнім, забытым.

У вёсцы як у звон білі, што Хомка сярод падворка выкапаў сажалку. Усе зайздросцілі: ні ў кога так блізка няма сажалкі.

У Хомкі шчасліва заходзіла сэрца. Усю істоту захліснула вірлівая радасць. Галаву кружыла п'янкое шчасце, калі ўяўляў жончын выцягнуты, збянтэжаны твар. Заранё бачыў яе разгубленасць. Не, не стане ён спавядацца перад бабаю. Паднядзелены, урачысты, упэўнена выйдзе на ганак і цвёрда скажа:

— Я тутака гаспадар. Захацеў — і сажалку выкапаў. А мог бы гару насыпаць!

І пераможна пасміхнецца.

Янусь МАЛЕЦ

Таццяна-атлант

Вось гэткі Вы мне якраз і трэба!
Мой самы строгі, самы не такі.
І лёгка мне трымаць над Вамі неба,
А для чаго яшчэ мне дзве рукі?

Таццяна ЗІНЕНКА.

Цяпер мужчыны, кажуць, не такія,
І ты не гэткі, самы не такі:
Сядзіш, як немаўля, ў мяне на шыі
І торкаеш нагамі пад бакі.
Я ж над табой яшчэ трымаю неба
І чую радасць жорсткае душы:
— Трымай, трымай, Таццяна, колькі трэба,
А вершыкі, дальбог, радзей пішы!

Пачутае «У Лявона»

Маркс і дойчмаркі

Студэнт-першакурснік звяртаецца да бібліятэкара:

— Кажуць, у вас можна браць «Капітал» Карла Маркса?

— Можна.

— То дайце і мне, калі ласка. Толькі пажадана адразу ў дойчмарках, а не ў «зайцах».

Адна каса

— Ці праўда, што ты выдаў замуж дачку за свайго касіра?

— Ну, так.

— Але ж ты казаў, што яму не давяраеш.

— Вядома. Затое цяпер украдзеныя з маёй касы грошы ён будзе аддаваць маёй дачцэ.

Плямы на сонцы

— Казік, скажы мне, як з'явіліся плямы на Сонцы?

— Гэта не на Сонцы, спадар настаўнік, гэта прыбіральшчыца дрэнна памыла акно.

Трайня і слёзы

— Хто гэта так моцна плача, ці не тая трайня, што нарадзілася ўчора ноччу?

— Не, гэта іхні бацька ў калідоры.

Не паспела

— Вой, Машанька, даруй, на мінулым тыдні я не змагла павіншаваць цябе са шлюбам. То прымі мае сардэчныя віншаванні зараз.

— Позна, даражэнькая. Я ўжо суткі як зноў халасцячка.

Думіна

Ёсць людзі, з якімі можна хадзіць толькі ў контрразведку.

Ул.КАЛЕЧЫЦКІ.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 33-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп. Адказны сакратар Здзіслаў Сіцька.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 3141

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 3999 паасобнікаў.
Падпісана ў друк 11.09.1995 г. у 15 гадзін.